В. І. Караткевіч, В. Г. Кастрыцкая

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# СУСВЕТ ТЭКСТ

10–11
класы

## ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Дапаможнік для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання**

В. І. Караткевіч, В. Г. Кастрыцкая

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# СУСВЕТ ТЭКСТ

## 10–11 класы

## ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Дапаможнік для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання**

*Рэкамендавана*
*навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Вучэбнае электроннае выданне

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2023

УДК 811.161.3'42(075.3)
ББК 81.2Беи-922

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры *І. М. Мішчанчук*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст», намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Маларыцкая раённая гімназія» *М. І. Навумчык*

Дадзены дапаможнік уваходзіць у вучэбна-метадычны комплекс па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці «Сусвет Тэкст», 10–11 класы

Вучэбна-метадычны комплекс факультатыўных заняткаў распрацаваны ў Нацыянальным інстытуце адукацыі ў межах выканання задання ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» і ўключаны ў зводны план выпуску (укаранення) зноў асвоенай прадукцыі (інавацый) па ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» на 2021–2025 гг., зацверджаны Міністэрствам адукацыі ад 17.02.2021. Мова выдання — беларуская.

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Камп'ютарная вёрстка *Я. І. Архіпавай*

Падпісана да карыстання 2023
Размешчана на сайце 2023

Аб'ем выдання 3999 КБ
Сістэмныя патрабаванні: ПЗ для прагляду дакументаў у фармаце pdf, ПЗ для чытання QR-кодаў

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ISBN 978-985-893-538-2
© Караткевіч В. І., Кастрыцкая В. Г., 2023
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

# Змест

## X клас


МОДУЛЬ 1. ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ: ЯК І ШТО ТРЭБА РАБІЦЬ ........ 7

Тэма 1. Фармуляванне мэты, задач праекта ........ 7
Тэма 2. Пошук крыніц інфармацыі ........ 9
Тэма 3. Веды, уменні і навыкі, рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі праекта або правядзення даследавання ........ 13
Тэма 4. Планаванне праектнай дзейнасці ........ 14

МОДУЛЬ 2. ВУЧЫМСЯ ПІСАЦЬ МАСТАЦКІЯ ТВОРЫ ........ 16

Тэма 1. Якой павінна быць сучасная мастацкая літаратура? ........ 16
Тэма 2. Збор інфармацыі для стварэння мастацкага твора ........ 17
Тэма 3. Адзінства формы і зместу ........ 18
Тэма 4. Слова. Вобраз. Тэма ........ 21
Тэма 5. Анатацыя як форма прэзентацыі мастацкага твора ........ 24
Тэма 6. Як не стаць графаманам ........ 25
Тэма 7. Ад натхнення да твора ........ 27
Тэма 8. Літаратурная крытыка ........ 28
Тэма 9. Афармленне зборніка мастацкіх твораў ........ 30
Тэма 10. Прэзентацыя зборніка мастацкіх твораў ........ 32


## IX класс


МОДУЛЬ 3. ПУБЛІЧНЫЯ ТЭКСТЫ ........ 35

Тэма 1. Крэалізаваныя тэксты і іх інтэрпрэтацыя ........ 35
Тэма 2. Рэкламны тэкст ........ 37
Тэма 3. Фестываль сацыяльнай рэкламы ........ 39

МОДУЛЬ 4. ДЗЕЛАВЫЯ ТЭКСТЫ ........ 40

Тэма 1. Дзелавыя тэксты: мэта, структура, прызначэнне ........ 40
Тэма 2. Аб’явы ........ 40
Тэма 3. Пісьмы ў дзелавой сферы ........ 41
Тэма 4. Аўтабіяграфія ........ 44
Тэма 5. Характарыстыка ........ 47
Тэма 6. Рэзюмэ ........ 48
Тэма 7. Распіска ........ 49
Тэма 8. Перамовы ........ 49
Тэма 9. Прэзентацыя альбома дзелавых тэкстаў ........ 50

## Умоўныя абазначэнні:

— тэарэтычныя звесткі

— заданні для самастойнай работы ці для выканання ў класе

! — правер сябе

Увесь выкарыстаны ілюстрацыйны матэрыял (фотаздымкі, выявы, інш.), акрамя QR-кодаў, узяты з адкрытых крыніц сеткі Інтэрнэт

# 10 клас

# МОДУЛЬ 1

# Праектная дзейнасць: як і што трэба рабіць

## Тэма 1. Фармуляванне мэты, задач праекта

Выразная мэта — першы крок да любога дасягнення.
*Уільям Клімент Стоўн.*

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна фармуляваць мэту і задачы праекта.

Паняцце «мэта» азначае вынік, на дасягненне якога скіраваны праект. Выкананне праекта не можа быць мэтай! Пры фармулёўцы мэты выкарыстоўвайце наступныя дзеясловы: *выявіць, вызначыць, устанавіць, даказаць, абгрунтаваць і да т.п.*

Каб дасягнуць мэты, трэба вызначыць, якія крокі для гэтага трэба зрабіць. Такія дзеянні называюцца задачамі. Ад добрай прадуманасці задач залежыць канчатковы вынік. Для фармулёўкі задач можна выкарыстаць наступныя дзеясловы: *вывучыць, прааналізаваць, разгледзець, разлічыць і да т. п.*

Важнае адрозненне мэты ад задач заключаецца ў тым, што мэта ўключае канчатковы вынік, а задача — прамежкавы. Напрыклад, каб пачаставаць дранікамі гасцей (мэта), нам трэба купіць бульбу, алей, соль, смятану, духмяныя травы; вызначыць неабходную колькасць кожнага з прадуктаў; падрыхтаваць бульбу; падрыхтаваць патэльню; падсмажыць дранікі; запраўміць іх смятанай. Гэтыя аперацыі і будуць нашымі задачамі. Кожны дзень мы ставім мэты і вырашаем задачы, каб нашы мэты былі дасягнуты.

Пры фармулёўцы мэты і задач праекта не дапускайце наступных памылак:

- мэта не звязана з тэмай;
- пры фармулёўцы мэты не зразумела, які канчатковы вынік аўтар жадае атрымаць;
- задачы не звязаны з мэтай;
- задачы дубліруюць мэту;
- задачы не адпавядаюць зместу праекта.

**Заданне 1.**

Уважліва прачытайце фрагмент трагедыі У. Шэкспіра «Гамлет», у якім закранаецца праблема маніпуляцыі: наколькі чалавек мае права выбару.

Р а з е н к р а н ц: Мой добры прынц, чым вы так расхваляваны? Вы самі чапляеце ланцугі на сваю незалежнасць, таячы гора сваё ад друга.

Г а м л е т: Мой дарагі, мне не даюць ходу.

Р а з е н к р а н ц: Як гэта можа быць, калі сам кароль прызначыў вас наследнікам дацкай кароны?

Г а м л е т: Так-то так, але «пакуль сонца ўзыдзе...». Старая прыказка.

*(Уваходзяць флейтысты.)*

А, флейтыі. Дайце мне адну. *(Бярэ флейту. Гільдэнстэрну.)* Хадзі сюды, скажу табе нешта на вушка. *(Адводзіць Гільдэнстэрна ўбок.)* Чаго ты круцішся вакол мяне, як ганчак? Чаго ты ўсё вынюхваеш? Ты што, у сецi хочаш мяне заманіць?

Г і л ь д э н с т э р н: О прынц, калі я перастараўся, то гэта значыць, што я вас вельмі люблю.

Г а м л е т: Я нешта не разумею. Пайграй на флейце.

Г і л ь д э н с т э р н: Я не магу, прынц.

Г а м л е т: Калі ласка.

Г і л ь д э н с т э р н: Паверце мне, я не магу.

Г а м л е т: Прашу цябе.

Г і л ь д э н с т э р н: Я не ведаю, як за яе брацца, прынц.

Г а м л е т: Гэта так жа лёгка, як хлусіць. Пакладзі пальцы на лады, дзьмі ў дзірачку, і гэты інструмент загаворыць прыгожаю музыкай. Глядзі сюды: вось адзін лад, вось другі.

Г і л ь д э н с т э р н: Мой прынц, але ж я не маю таленту, я не ведаю законаў гармоніі.

Г а м л е т: Бачыш, якую дрэнь ты з мяне робіш! Ты хочаш іграць на мне; ты думаеш, што ты ведаеш мяне; ты хочаш улезці ў маю душу, вырваць маю тайну і перабіраць лады майго сэрца ад самай нізкай да самай высокай ноты. Вось у гэтым маленькім інструменце многа гармоніі, цудоўны голас, аднак ты не можаш прымусіць яго загаварыць. Чорт вазьмі, думаеш ты, што на мне лягчэй іграць, чым на флейце? Назаві мяне якім хочаш інструментам, ты можаш расстроіць мяне, але не іграць на мне.

Для выканання задання можна паглядзець фрагмент мастацкага фільма «Гамлет» (рэж. Р. М. Козінцаў, 1964): https://www.youtube.com/watch?v=Aw6KlkwJhu4 (Малюнак 1)

*Мал. 1.* QR-код для прагляду фрагмента мастацкага фільма «Гамлет» (рэж. Р. М. Козінцаў, 1964)

У прапанаваным тэксце Разенкранц і Гільдэнстэрн ажыццяўляюць маніпулятыўныя дзеянні з мэтай даведацца пра намеры Гамлета, упэўніць яго ў тым, што кароль добра ставіцца да прынца. Гамлет спрабуе супрацьстаяць маніпулятыўным дзеянням, адцягваючы размову ў іншы бок, а потым і ўвогуле параўноўвае сябе з флейтай.

**З улікам інфармацыі, якую вы атрымалі вышэй, сфармулюйце мэту магчымага праекта (магчымых праектаў) даследавання з прыцягненнем фактаў з літаратуры, гісторыі, уласнага жыццёвага вопыту.**

### Заданне 2.

Уважліва прачытайце выказванне Уладзіміра Содаля пра выбар псеўданіма Францішакам Багушэвічам.

Францішак Багушэвіч, як вядома, меў некалькі літаратурных псеўданімаў. <...> Самы вядомы з іх — Мацей Бурачок. Пад гэтым псеўданімам Ф. Багушэвіч выдаў у 1891 годзе ў Кракаве «Дудку беларускую», а таксама падрыхтаваў да друку зборнік «Беларускія апавяданні Бурачка» (1899). Як вядома, «Дудка

беларуская» была першай кніжкай паэта, менавіта яна адкрыла свету новае літаратурнае імя. Пэўна таму за Ф. Багушэвічам стала замацавауся псеўданім першага яго зборніка — Мацей Бурачок. Таму, натуральна, нас зацікавіла паходжанне псеўданіма.

Як нам думаецца, Ф. Багушэвіч запазычыў імя з папулярнай у дзевятнаццатым стагоддзі батлеечнай інтэрмедыі «Мацей і доктар».

Запазычыў не выпадкова. Асноўны персанаж гэтай вясёлай, на першы погляд немудрагелістай інтэрмедыі селянін Мацей быў адным з самых любімых у народзе батлеечных герояў, Францішак Багушэвіч неаднойчы на свае вочы бачыў, як прыхільна сустракала яго з'яўленне на сцэне вясковая публіка падчас кірмашовых святаў. Гледачам імпанаваў яго мяккі гумар, гуллівае беларускае слова. Але не толькі гэтым прывабіў паэта батлеечны персанаж. Ф. Багушэвіча ўразіла манера апавядання Мацея. Знешне камічная, яна несла трагічны змест. Вось Мацей, нібы насміхаючыся з самога сябе, іранічна расказвае, як ён аднаго разу наеўся ў пана Бараноўскага куцці, што не мог «сапці» — у жываце зрабілася «няспраўнасць», «бурчэнне»; як ён лячыўся: «мохам, чартапалохам, гласам, купервасам ды бурачковым квасам і яшчэ чымсьці...». А за гэтай гуллівасцю — крык сялянскай душы: «Паглядзіце, як мы жывём!.. Да чаго нас паны давялі! Мы нават у свята не маем чаго з'есці... А як нас лечаць?» Такая форма апавядання — паказ трагічнага праз камічнае — была блізкая і зразумелая Багушэвічу. Яна адпавядала духу яго творчасці, і ён, калі ўзнікла патрэба выдаць першы зборнік, без асаблівых ваганняў скарыстаў імя папулярнага батлеечнага персанажа, жадаючы падкрэсліць, што ён будзе гаварыць тую ж праўду пра сялянскую нядолю і тымі ж сродкамі ці блізкімі да іх, што і персанаж інтэрмедыі. Яскравае пацвярджэнне гэтаму вершы Ф. Багушэвіча, змешчаныя ў «Дудцы беларускай». У пераважнай большасці яны і напісаны ад імя селяніна-бедака.

*Содаль, У. Людзьмі звацца / У. Содаль. —*
*Мінск : Редакция газеты «Голас Радзімы», 1977. — С. 39–40.*

Уявіце, што вы павінны напісаць сцэнарый кароткаметражнага фільма «Хто такі Мацей Бурачок?» Абапіраючыся на прыведзены вышэй тэкст, а таксама іншыя крыніцы інфармацыі, сфармулюйце задачы, якія трэба вырашыць для напісання гэтага сцэнарыя.

## Тэма 2. Пошук крыніц інфармацыі

Вакол нас раскіданы адказы на любыя пытанні, трэба толькі здолець адшукаць іх.
*Марыям Петрасян «Дом, у якім...».*

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна знаходзіць крыніцы інфармацыі, ацэньваць іх з пункту погляду праўдзівасці і неабходнасці для дасягнення мэты; уменне афармляць крыніцы інфармацыі.

Вы ўжо не раз сутыкаліся з неабходнасцю падбору інфармацыі для падрыхтоўкі паведамлення, напісання рэферата ці сачынення. Вось некалькі парад, каб зрабіць працу з інфармацыяй больш прадуктыўнай.

1. Трэба вызначыцца з тэмай, запісаць план будучай работы. Гэта дапаможа вызначыцца, якія веды ў вас ужо ёсць, а якой інфармацыі не хапае.
2. Важна прагледзець як мага болей крыніц інфармацыі: кнігі, часопісы, відэалекцыі, відэаканферэнцыі і падобнае.
3. З усіх крыніц трэба выбраць праўдзівыя. Як гэта зрабіць? Памятайце, што ні адна крыніца не з'яўляецца на 100 % праўдзівай, за выключэннем навуковых крыніц, якія маюць у сваёй аснове рэальныя доказы. Вельмі часта сёння людзі размяшчаюць інфармацыю ў сетцы Інтэрнэт, але не правяраюць і своечасова не рэдагуюць яе. Найбольшы давер выклікаюць наступныя крыніцы:

- навуковыя манаграфіі;
- даклады на навуковых канферэнцыях, лекцыі вучоных;
- навукова-папулярныя артыкулы;
- публіцыстычныя творы (калі гутарка ідзе пра актуальныя праблемы і з'явы сацыяльнага жыцця);
- зарэгістраваныя сродкі масавай інфармацыі.

Інфармацыю, якую вы атрымліваеце з іншых крыніц, трэба абавязкова пераправяраць, супастаўляць факты з прыведзенымі ў іншых крыніцах.

**!** *Адкажыце на некалькі пытанняў наступнага тэсту. Уявіце, што трэба падрыхтаваць паведамленне пра эканамічную сітуацыю ў краіне.*

I. Якая крыніца з'яўляецца найбольш праўдзівай?
   а) блог «Дзядзя Ваня адкажа на ўсе пытанні»
   б) артыкул у штодзённай гарадской газеце
   в) партал Нацыянальнага статыстычнага камітэта

II. Якой крыніцы можна найбольш давяраць?
   а) думка мастацтвазнаўцы
   б) вынікі апытвання жыхароў дома
   в) даследаванне доктара эканамічных навук

III. Якой крыніцы давяраць нельга?
   а) блог эканаміста пра эканоміку
   б) сайт Міністэрства эканомікі
   в) сацыяльная сетка

IV. Якая крыніца будзе выклікаць найменшы давер?
   а) выступленне вучонага на канферэнцыі
   б) артыкул у спецыялізаваным эканамічным часопісе
   в) мастацкі твор

Калі вы на ўсе пытанні далі адказ *в)*, то вы няблага разбіраецеся, якімі крыніцамі трэба карыстацца. Калі сярод вашых адказаў сустрэліся а) і б), то не трэба атрымаць больш ведаў пра крыніцы інфармацыі. Пачаць можна з выступлення доктара біялагічных навук, доктара філалагічных навук, прафесара Таццяны Чарнігаўскай: https://psy.su/feed/9496/ (малюнак 2).

*Мал. 2.* QR-код для прагляду выступлення Т. Чарнігаўскай

4. Нельга абмяжоўвацца сеткай Інтэрнэт! Ёсць яшчэ бібліятэкі, дзе сабрана неверагодная колькасць праўдзівай інфармацыі.

**5.** Пры падборы крыніц інфармацыі для работы над тэмай неабходна задаць сабе шэсць пытанняў, якія вучацца задаваць рэпарцёры: «ШТО здарылася?», «ХТО ў гэтым удзельнічае?», «КАЛІ гэта здарылася?», «ДЗЕ здарылася?», «ЧАМУ так здарылася?», «ЯК гэта здарылася?».

Гэтыя пытанні трэба задаць, каб сабраць розную інфармацыю з розных крыніц і стварыць аб’ёмную карціну рэчаіснасці. Калі адказы на ўсе пытанні атрыманы, трэба зрабіць адбор інфармацыі: што павінна быць уключана ў работу, а што можна апусціць.

**6.** Для эфектыўнага пошуку інфармацыі трэба правільна падабраць ключавыя словы. Гэта такія словы і словазлучэнні, якія вы пішаце ў пошукавым радку Google, Yandex або іншай сістэмы, а тая апрацоўвае запыт і выдае пералік старонак сайтаў, з якіх вы выбіраеце патрэбныя. Калі вынік не задавальняе, трэба ўдакладніць запыт.

**7.** Не трэба чытаць усе кнігі, якія вам рэкамендуюцца, ад пачатку да канца. Трэба выбіраць неабходную інфармацыю, якая з’яўляецца найбольш дакладнай і актуальнай. Вучыцеся выбіраць інфармацыю праз хуткі прагляд тэкстаў. Ключавыя словы, тэмы, неабходныя для работы, трэба шукаць у змесце кнігі. Уважліва чытайце анатацыі да кніг і ўступную частку. У час чытання запісвайце важныя думкі і адзначайце ключавыя моманты. Можна выкарыстоўваць закладкі і заўвагі на палях кнігі (калі кніга чужая, то заўвагі лепш пісаць не на полі, а на ліпкай паперы для нататак).

**8.** Каб быць упэўненым у праўдзівасці інфармацыі, трэба задаваць пытанні, аналізаваць і супастаўляць факты з розных бакоў. Памятайце, што факт — тое, што здарылася ў рэальнасці, а меркаванне — чыйсьці пункт погляду. Адрознівайце факты ад меркаванняў.

**9.** Пры афармленні крыніц інфармацыі трэба апісваць іх так, каб іншы чалавек мог іх знайсці. Калі ваша работа мае навуковы характар, то і апісваць крыніцы трэба так, як у навуковай працы. Як гэта зрабіць, можна знайсці тут: https://vak.gov.by/bibliographicDescription (мал. 3).

*Мал. 3.* QR-код для прагляду ўзораў бібліяграфічнага апісання крыніц

### Заданне 3.

Прачытайце ўрывак з тэксту пра вядомага вучонага і мастака Язэпа Драздовіча. Звярніце ўвагу на яго аўтапартрэт, напісаны ў 1943 годзе (малюнак 4). Тут майстар выявіў тры ўласныя іпастасі, тры характэрныя рысы сваёй асобы — Драздовіч-мастак, які паліць люльку і трымае пэндзаль у руцэ, Драздовіч-гісторык пільна ўзіраецца ў кнігу, і Драздовіч-астраном, задуменна разглядвае рукапіс з выявамі планет.

Сярод талентаў больш і менш значных, больш і менш знакамітых ёсць імёны асаблівыя, азораныя яркасцю асобы мастака, драматызмам яго жыццёвага



*Мал. 4.* Язэп Драздовіч «Аўтапартрэт» (1943)

шляху, а перадусім — моцай выяўлення нацыянальнага пачатку. <…> У гэтым шэрагу, безумоўна, і самабытнае імя Язэпа Драздовіча.

<…> Перш за ўсё ўражвае кола яго інтарэсаў і захапленняў. Ён маляваў і вучыў маляваць, збіраў экспанаты для музея і раскопваў старажытныя гарадзішчы, запісваў фальклор і замалёўваў замкі, адкрыў школку на роднай мове і стварыў аматарскі тэатр, пісаў працы па астраноміі і быў неблагім хірамантам. А яшчэ ён адмыслова валодаў родным словам, што не толькі дазволіла яму выдаць кнігу прозы, але і з выключнай выразнасцю занатаваць у дзённіку перыпетыі свайго нялёгкага жыцця, думкі і пачуцці, яву і сны.

А ява была бязрадаснай. Новы, 1933 год пачынаецца голадам, холадам і звыклым ужо беспрацоўем: два гады, як ён страціў выкладчыцкую працу і перабіваецца выпадковымі, эпізадычнымі заробкамі. Настрой прыгнечаны <…>

Мастак бярэцца за любую, нават самую дробную работу, каб зарабіць нейкую капейчыну: малюе дэкарацыі для аматарскіх спектакляў, шыльды, пераносіць кнігі для музея і да т. п. «Ой, як трудна грошы даюцца!» — гэты крык душы вырвецца ў яго пазней, у час бясконцых вандровак па Дзісеншчыне, але і зараз становішча не з лепшых. Урэшце рэшт Драздовіч пакідае Вільню і выпраўляецца на радзіму, да братоў. Там, у Антаполлі, «не маючы ані палатна, ані фарбаў, ані адпаведнага мейсца», ён ахвотна займаецца разьбой па дрэве. Жыццё праходзіла размерана-будзённа, у чаргаванні дробных падзей і здарэнняў. Параніў правую руку… Назбіраў хмелю на лякарства… Змайстраваў стол для разьбы… Зламаў найлепшае разьбярскае долата… Вылепіў з гліны галаву вясёленькага анёлка… Потым пайшла мода ў ваколіцах, кожная нявеста лічыла за гонар мець у сябе свой, асаблівы распісны дыван. Так што заказаў хапала.

Праз тры гады вандроўнай працы (дзе маляваў — там і жыў, там і сталаваўся) мастак запіша ў дзённіку: «Шчасліў той, хто маець час на вольную творчую працу. Хто пры добрым здароўі і без клопату аб заўтрашнім дні. Хто не маець патрэбы прадаваць свой час на грош дзеля хлеба». Зарабляючы на жыццё «так званымі», як ён піша, «каўрамі», мастак, тым не менш, ніколі не апускаецца да халтуры і ясна ўсведамляе сваю мастакоўскую звышзадачу: «Людзям даю. Хай узгадоўваюць у сабе пачуццё эстэтыкі».

Для задушаных працай вяскоўцаў яго прыход быў, бадай што, святам. Асабліва гэта тычыцца моладзі, што ахвотна запрашала старога халасцяка на вечарынкі, дзе ён «пяяў, іграў, жартаваў, баіў», варажыў па руках і ў свае сорак мог прайсціся калясом. А яшчэ ён у вёсках любіў ладзіць сапраўдныя лекцыі па астраноміі: з дапамогай лямпы і гарбуза тлумачыў паходжанне фазаў Месяца.

Вось мы і падышлі да адной з найцікавейшых старонак у біяграфіі і дзённіку Язэпа Драздовіча — да яго фантастычных сноў. Першыя згадкі пра іх прыпадаюць на 1914 год, калі мастак знаходзіўся на вайсковай службе і дасылаў у «Нашу ніву» апісанні сваіх начных прывідаў. З ранніх жывапісных работ на касмічную тэму вядомыя яго «Трывеж», «Артаполіс», пазней распрацоўваюцца яшчэ тры серыі з жыцця на Месяцы, Марсе і Сатурне. Лічыцца, што ў іх мастак увасабляе свае мары пра гарманічнае грамадства і некрануты свет прыроды, што і ў гэтых творах выяўляецца яго багатая фантазія. З такім поглядам можна было б цалкам пагадзіцца, каб не тыя самыя «сны» — праява своеасаблівага прыроднага феномена. Справа ў тым, што ўсім жывапісным і графічным работам на тэму космасу папярэднічалі падрабязнейшыя пісьмовыя занатоўкі пабачанага ў «начных

візіях». У гэтага чалавека была ўнікальная здольнасць — падарожнічаць, або, прасцей кажучы, лётаць у снах, пераносіцца з нашай рэальнасці ў ірэальныя, так званыя тонкія свету. Прычым яму здавалася, што неверагодныя карціны разгортваюцца на бліжэйшых планетах.

*Галіна Каржанеўская «Космас Язэпа Драздовіча: ява і сны»*
*Рэжым доступу : https://drazdovich.by/article/5*

Вызначце ключавыя словы, якія адлюстроўваюць змест прапанаванага тэксту. Ажыццявіце пошук па вызначаных словах.

Складзіце спіс крыніц па тэме «Язэп Драздовіч: чалавек, вучоны, мастак».

**Заданне 4.**

Вам неабходна падрыхтаваць паведамленне «Роля мастацтва ў нашым жыцці». Падбярыце ключавыя словы і складзіце спіс крыніц па вызначанай тэме.

## Тэма 3. Веды, уменні і навыкі, рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі праекта або правядзення даследавання

Ніхто не можа ведаць усё.
*Гарацый.*

**Плануемыя вынікі:** уменне вызначаць неабходныя веды, уменні і навыкі, а таксама рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі праекта.

Перш чым пачаць любую працу, трэба добра падрыхтавацца: вызначыць, якія рэсурсы нам спатрэбяцца. для рэалізацыі праекта. Іншымі словамі, трэба вызначыць хто і што нам трэба. Рэсурсы бываюць розныя:

- людзі — самы важны рэсурс; каманда праекта — выканаўцы (яны могуць пры неабходнасці выкарыстоўваць веды і вопыт сваіх родных, знаёмых), а таксама тыя, хто дапамагае парадамі і падтрымлівае матэрыяльна, эксперты; без каманды паспяхова ажыццявіць праект вельмі цяжка;
- інфармацыя — тое, што трэба ведаць, у чым разабрацца для рэалізацыі праекта;
- матэрыялы і абсталяванне — прадметы (інвентар, канцылярскія рэчы), гаджэты, камп'ютарная тэхніка і інш., неабходныя для рэалізацыі праекта;
- фінансы — грошы, якія спатрэбяцца для набыцця матэрыялаў, аплаты працы спецыялістаў і інш.;
- час, неабходны для паспяховага завяршэння праекта.

Для таго, каб мець усе рэсурсы, трэба задзейнічаць уласны сацыяльны капітал (уласных знаёмых, знаёмых сяброў і таварышаў).

Напрыклад, выдаць зборнік вершаў могуць дапамагчы розныя людзі. Сяброўка Надзея добра малюе, яна можа намаляваць арыгінальную вокладку, зрабіць некалькі ілюстрацый. Настаўніца Ірына Іванаўна можа дапамагчы напісаць прадмову і адрэдагаваць вершы. Сусед дзядька Міканор працуе ў друкарні і зможа дамовіцца пра зніжку на друкаванне зборніка. Стрыечны брат Валера працуе ў мясцовай газеце і вядзе блог з мясцовымі навінамі, ён можа размясціць навіну пра выхад зборніка. Так, выкарыстоўваючы ўласны сацыяльны капітал,

можна значна аблегчыць шлях свайго зборніка ад пісьмовага стала да ўдзячнага чытача.

Праца ў камандзе амаль заўсёды з'яўляецца больш эфектыўнай, чым асобна:

- у каманды заўсёды больш крэатыўных ідэй, бо ў спрэчках нараджаецца самая цікавая;
- каманда мае больш магчымасцей, бо мае большы сукупны сацыяльны капітал;
- у каманды ёсць агульная мэта, таму ёсць надзея на дапамогу.

Для паспяховай працы каманды лідар павінен зрабіць наступнае:

- вызначыць, якія людзі і для якіх задач патрэбны;
- пазнаёміць усіх з канчатковай мэтай праекта (кожны павінен аднолькава разумець канчатковы прадукт), улічваць зацікаўленасць кожнага ўдзельніка каманды (што атрымае кожны ўдзельнік);
- быць гатовым адказваць на пытанні або шукаць адказы на пытанні;
- дэманстраваць уласную зацікаўленасць;
- не забываць, што без працы кожнага не магчыма дасягнуць мэты.

**Заданне 5.**

Уявіце сабе, што Вы дырэктар выдавецтва «Доктар Ватсан», якое збіраецца выдаваць дэтэктывы. З усіх рэсурсаў Вам не хапае толькі людзей. Якіх спецыялістаў неабходна наняць, якімі кампетэнцыямі яны павінны валодаць? Сфармулюйце адказ у выглядзе аб'явы ці серыі аб'яў аб прыёме на работу.

Памятайце, што выдавецтва займаецца падборам кніг, падрыхтоўкай да выдання кніг, іх афармленнем і продажам, друкаваннем можа займацца і іншая арганізацыя.

**Заданне 6.**

Да дня нараджэння Якуба Коласа падрыхтуйце праект-квэст «Падарожжа па творах класіка». Вызначце, якія веды і якія ўменні спатрэбяцца для паспяховай рэалізацыі гэтага праекта.

## Тэма 4. Планаванне праектнай дзейнасці

Хацела лёту — і цяпер ты птушка.
*Мікола Шабовіч «Нам развітання хочацца пазбегнуць…»*

**Плануемыя вынікі:** уменне планаваць праектную дзейнасць.

Паспяховы праект ад самага пачатку стварэння павінен адпавядаць некаторым параметрам:

- арыентацыя на стварэнне чагосьці новага (выяўленне найбольш эфектыўных, прыймальных новых рашэнняў або вядомых ідэй, якія прымяняюцца да новых умоў);
- арыентацыя на жыццёвую неабходнасць (трэба вырашаць не проста новую задачу, а мець непасрэдныя адносіны да жыцця, да ўнутранага свету, жыццёвых прыярытэтаў);

- уключэнне навуковага кампанента (пошукавы, творчы і інш.), які вызначае агульную скіраванасць і агульны вынік работы.

У агульных рысах арганізацыя праектнай дзейнасці ўключае чатыры этапы: уваход у праблему, арганізацыя дзейнасці, ажыццяўленне дзейнасці, прэзентацыя вынікаў дзейнасці (уключаючы самааналіз і самаацэнку вынікаў) (табл. 1).

*Табліца 1*

| Этап праекта | Неабходныя дзеянні |
|---|---|
| I. Уваход у праблему праекта | • Фарміраванне каманды;<br>• фармулёўка праблемы праекта, мэты і задач;<br>• вызначэнне перспектыў развіцця праекта, неабходных рэсурсаў;<br>• засваенне ўсімі ўдзельнікамі каманды канчатковай мэты рэалізацыі праекта;<br>• вызначэнне лідара праекта |
| II. Арганізацыя дзейнасці па рэалізацыі праекта | • Стварэнне каляндарнага плана ў адпаведнасцямі з задачамі праекта;<br>• прызначэнне выканаўцаў і адказных за вырашэнне канкрэтных задач у адпаведнасці з індывідуальнымі магчымасцямі і чаканнямі ад праекта;<br>• выбар формы і спосабаў прэзентацыі канчатковага прадукту;<br>• збор першаснай інфармацыі |
| III. Ажыццяўленне дзейнасці | • Пошук, збор і сістэматызацыя інфармацыі;<br>• праца з экспертамі;<br>• падрыхтоўка прэзентацыі вынікаў дзейнасці |
| IV. Прэзентацыя вынікаў дзейнасці | • Прэзентацыя вынікаў дзейнасці;<br>• самааналіз і самаацэнка вынікаў дзейнасці |

Пры выбары тэмы праекта трэба арыентавацца не толькі на ўласную зацікаўленасць, але і на тое, якую карысць праект можа прынесці іншым.

**Заданне 7.**

Прапануйце ўласную тэму для праекта, звязанага з развіццём літаратуры і мастацтва. Вызначце мэту, задачы гэтага праекта, складзіце каляндарны план работы.

# МОДУЛЬ 2

## Вучымся пісаць мастацкія творы

### Тэма 1. Якой павінна быць сучасная мастацкая літаратура?

Сучасная літаратура — у руху, у спаборніцтве пісьменнікаў і твораў.
*Уладзімір Гніламёдаў.*

**Плануемыя вынікі:** уменне рэалізоўваць праект пры падтрымцы настаўніка.

**Заданне 8.**

Паводле прапанаванага пашпарта рэалізуйце праект «Якой павінна быць сучасная мастацкая літаратура?». Абмяркуйце з настаўнікамі і аднакласнікамі магчымыя змены ў пашпарце праекта. Рэалізацыя гэтага праекта адкажа на пытанні «Якія тэксты патрэбны людзям?», «Пра што буду пісаць я?».

Тэма: Якой павінна быць сучасная мастацкая літаратура?

Выканаўцы: вучні X класа.

Працягласць: 1 месяц.

Мэта: вызначыць асаблівасці сучаснай літаратуры і іх сувязь з чытацкімі прыярытэтамі дарослых і дзяцей.

Задачы:

- прааналізаваць творчасць пісьменнікаў і паэтаў сучаснасці;
- вызначыць узровень ведаў сучаснай літаратуры ў розных узроставых групах чытачоў;
- вызначыць найбольш папулярных сучасных пісьменнікаў;
- высветліць, якія віды, формы, жанры літаратуры найбольш цікавяць чытачоў;
- прааналізаваць атрыманыя вынікі і зрабіць адпаведныя высновы.

Рэкамендацыі па правядзенні. Праект выконваецца як групавы. Вучні разбіваюцца на наступныя групы:

- тэхнічная (3-5 чалавек);
- творчая (3-5 чалавек);
- інфармацыйна-даследчая (5-6 чалавек).

У кожнай групе трэба выбраць лідара, які будзе каардынаваць дзейнасць выканаўцаў. Асноўным кансультантам для ўсіх груп з’яўляецца настаўнік.

Тэхнічная група забяспечвае набор тэкстаў, сканіраванне фотаздымкаў, перасылку інфармацыі.

Творчая група стварае анкеты, сцэнарыі інтэрв’ю, прэзентацыі вынікаў праектнай дзейнасці, арганізуе і праводзіць гэту прэзентацыю.

Інфармацыйна-даследчая група праводзіць анкетаванне, інтэрв’ю, ажыццяўляе пошук і прадастаўленне неабходнай інфармацыі.

Метады правядзення даследавання:

- анкетаванне;
- параўнанне і аналіз анкет;
- апытванне розных катэгорый рэспандэнтаў;
- праца з мастацкай і публіцыстычнай літаратурай, іншымі інфармацыйнымі крыніцамі для павышэння ўласнага кругагляду і па магчымасці выступлення ў якасці эксперта па праблемах чытання і патэнцыялу асобных тэкстаў;
- напісанне эсэ «Чытай, бо…».

## Тэма 2. Збор інфармацыі для стварэння мастацкага твора

Мой любімы верш — той, які пачынаецца са слоў «Трыццаць дзён у верасні», паколькі ў ім ёсць хоць нейкая праўдзівая інфармацыя.
*Граўча Маркс, амерыканскі акцёр, комік.*

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна збіраць інфармацыю, якая можа стаць грунтам для напісання мастацкага твора.

Што рабіць, калі ёсць патрэба напісаць мастацкі твор? З чаго пачаць? А пачынаць трэба са збору інфармацыі. Калі паўстала праблема пра што пісаць, то прыслухайцеся да некалькіх парад.

1. Пагартайце падшыўку мясцовай газеты за некалькі месяцаў. Там, як правіла, змяшчаецца шэраг цікавых і актуальных матэрыялаў, якія могуць стаць зыходным пунктам для напісання апавядання ці аповесці. Можна апісаць тое, што адбылося пасля (праз дзень, месяц, год) ці перад (за дзень, тыдзень) да здарэння.
2. Зазірніце ў каляндар. Там шмат цікавых гістарычных падзей, якія могуць стаць штуршком да стварэння сюжэта.
3. Паназірайце за людзьмі, якія вакол вас. Кожны з'яўляецца ўнікальным і заслугоўвае таго, каб стаць героем мастацкага твора.
4. Прасачыце, як на тых людзей, што вакол вас, уплываюць розныя падзеі (змены ў арганізацыі навучання, аб'ява пра нечаканую паездку, просьба дапамагчы іншым, маштабныя падзеі ў свеце — эпідэмія COVID-19, сусветны эканамічны крызіс і інш.).
5. Уважліва слухайце, пра што гавораць людзі ў грамадскіх месцах (магазінах, тэатрах, у аўтобусе і г. д.).

Безумоўна, гэтым пералікам абмяжоўвацца нельга. Збіраць інфармацыю для будучых мастацкіх твораў можна паўсюль. Толькі трэба ўважліва прыглядзецца.

Памятайце, што важна не толькі сабраць інфармацыю, але і адабраць тую, якая з'яўляецца важнай менавіта для раскрыцця характару героя будучага твора.

**Заданне 9.**

Па дарозе са школы паназірайце за людзьмі. Паспрабуйце вызначыць узрост чалавека, чым ён займаецца. Прыдумайце схему будучага апавядання, у цэнтры якога будзе чалавек, за якім вы назіралі.

**Заданне 10.**



*Мал. 5.* Герб Школы Вядзьмарства і Чараўніцтва «Хогвартс»

Уявіце сабе, што ў адзінай школе магіі — Хогвартсе адбываюцца выбары дырэктара. Напішыце план перадвыбарчай прамовы аднаго з кандыдатаў (на ваш выбар адзін з герояў цыкла раманаў Дж. Роўлінг пра Гары Потара або іншы літаратурны персанаж). Пры гэтым улічыце наступныя звесткі пра Хогвардс. Можна выкарыстаць іншыя звесткі, сабраныя на старонках кніг Дж. Роўлінг. Якія дадатковыя звесткі вам спатрэбяцца?

Афіцыйная назва Hogwarts School of Witchcraft and Wizardry або, радзей, Hogwarts Academy of Witchcraft and Wizardry, у перакладах — Школа / Акадэмія Вядзьмарства і Чараўніцтва «Хогвартс» (малюнак 5).

Па словах выкладчыка гісторыі магіі, Катберт Бініса, Хогвартс быў заснаваны каля тысячы гадоў таму чатырма чараўнікамі: калдунамі Годрыка Грыфіндорам (англ. Godric Gryffindor), Салазарам Слізэрынам (англ. Salazar Slytherin), і чараўніцамі Кандыдай Кагцеўран (англ. Rowena Ravenclaw)) і Пенелопай Пуфендуй (англ. Helga Hufflepuff). Мэтай заснавальнікаў было навучанне і выхаванне дзяцей з магічным патэнцыялам. Гэтых дзяцей збіралі па ўсёй краіне. Аднак з часам сярод заснавальнікаў адбыўся раскол. Салазар Слізэрын лічыў, што ў школе не варта навучаць дзяцей, бацькі якіх былі магламі, а прымаць неабходна дзяцей толькі з сем'яў чараўнікоў. Непаразуменні паміж Слізэрынам і астатнімі заснавальнікамі прывялі да таго, што Салазару Слізэрыну давялося пакінуць сцены школы.

Навучанне ў Хогвартсе доўжыцца 7 гадоў. У канцы кожнага года здаюцца іспыты, але асабліва важныя для вучня ў будучым іспыты ў канцы 5-га і 7-га гадоў навучання. Колькасць вучняў Хогвартса дакладна невядома, але хутчэй за ўсё, туды прымаюцца абсалютна ўсе дзеці-чараўнікі з Вялікабрытаніі.

Кіруюць школай дырэктар і намеснік дырэктара. Дырэктар дае справаздачу перад Саветам папячыцеляў, які складаецца з 12 чалавек.

Навучанне ў школе бясплатнае, але кнігі і школьны інвентар навучэнцы звычайна купляюць самі. Аднак ёсць спецыяльны фонд для набыцця падручнікаў і школьнага інвентару маламаёмасным вучням.

## Тэма 3. Адзінства формы і зместу

Форма без зместу — гэта званок, які не гучыць.

*Оскар Блюменталь, нямецкі драматург, паэт і тэатральны крытык.*

**Плануемыя вынікі:** асэнсаванне вучнямі адзінства і ўзаемаўплыву формы і зместу ў мастацкім творы.

Форма і змест — гэта два бакі мастацкага твора, якія вылучаюцца толькі падчас яго аналізу. Непасрэдна ў самім творы форма і змест складаюць мастацкае цэлае і заўсёды неаддзельныя адно ад другога.

Змест — гэта сэнс літаратурнага твора, які ўвасоблены ў своеасаблівай, вобразнай форме.

Вывучэнне зместу з розных бакоў вядзе ад неглыбокіх, павярхоўных меркаванняў пра абраны пісьменнікам матэрыяле да дакладнага разумення настрояў, ідэй, светаўспрымання аўтара, якія выяўлены ў творы. У змесце літаратурнага твора адрозніваюць тры бакі:

- тэма (сукупнасць тэм — тэматыка);
- праблема (сукупнасць праблем — праблематыка);
- аўтарская пазіцыя.

Форма — гэта спосаб выяўлення зместу літаратурных твораў, які заўсёды якім-небудзь чынам аформлены. Элементы зместу не могуць існаваць па-за формай. Літаратурна-мастацкая форма шматпланавая, складаная з’ява. Аналіз формы мастацкага твора прадугледжвае вывучэнне трох яго асноўных бакоў:

- прадметы выяўлення (усе намаляваныя аўтарам жыццёвыя з’явы);
- кампазіцыя;
- мова твора.

Форма мастацкага твора адрознівае літаратуру ад іншых форм маўленчай дзейнасці — публіцыстыкі, навуковага артыкула, інфармацыйнага паведамлення і інш. Пра чалавека і яго свет можна расказваць па-рознаму. Думкі, пачуцці, выражаныя пісьменнікам у творы, неаддзельныя ад мастацкай формы, створанай ім і ўласцівай толькі яму.

Мастацкі твор уяўляе сабой унутранае адзінства формы і зместу. Гэтыя паняцці непарыўна звязаны і ўзаемаўплываюць адно на другое: чым больш складаны змест твора, тым больш багатай павінна быць яго форма. Змест і форма літаратуры з’яўляюцца асноватворнымі літаратуразнаўчымі паняццямі, яны абагульняюць у сабе ўяўленні пра ўнутраныя і знешнія бакі літаратурнага твора.

### Заданне 11.

Уважліва паглядзіце на малюнкі розных архітэктурных збудаванняў (малюнкі 6, 7, 8). Вызначце, якое іх прызначэнне? Ці звязана знешняя форма будынка і яго прызначэнне?



*Мал. 6.* Касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў Гервятах



*Мал. 7.* Адкрытае акцыянернае таварыства «Магілёўхімвалакно»




*Мал. 8.* Нацыянальная бібліятэка Беларусі

### Заданне 12.

Вядомы пісьменнік Крыстафер Букер у сваёй кнізе «Сем асноўных сюжэтаў: чаму мы расказваем гісторыі» апісаў сем базавых сюжэтаў, на аснове якіх напісаны ўсе кнігі ў свеце:

1. «З балота ды ў пазалоту». Самы яркі прыклад раскрыцця такога сюжэту — Папялушка. У такіх кнігах расказваецца пра тое, як герой дзякуючы ўласным намаганням або пэўным абставінам дасягае вяршынь.
2. «Падарожжа»: апісанне цяжкага падарожжа для дасягнення пэўнай мэты.
3. «Туды і назад»: апісанне намаганняў героя, які дзякуючы абставінам быў вырваны са звычайнага жыцця, але змог вярнуцца ў камфортныя ўмовы.
4. «Камедыя». Гісторыі, заснаваныя на блытаніне, непаразуменні, што вядзе да канфлікту. У фінале гісторыя разблытваецца і ўсе атрымліваюць тое, што заслугоўваюць.

5. «Трагедыя». Абавязковым элементам з’яўляецца смерць адмоўнага героя або яго паражэнне. Гэта пакаранне за яго ўчынкі.
6. «Уваскрасенне». Гісторыя пра вызваленне героя ад пракляцця або цёмных сіл.
7. «Перамога над страшыдлам». Герой змагаецца і перамагае монстра (яўнага ці ўяўнага), за гэта атрымлівае прыз — матэрыяльныя выгоды ці душэўную асалоду.

Аб’яднайцеся ў групы па 3–4 чалавекі і прыдумайце схемы будучых мастацкіх твораў, у якіх былі б увасоблены вызначаныя К. Букерам сюжэты. Падумайце, у якой форме (якім жанр) вы ўвасобіце свае творы. Вынікі абмеркавання занясіце ў наступную табліцу (табліца 2):

*Табліца 2*

| № сюжэта | Схема (кароткі змест) мастацкага твора | Магчымая форма ўвасаблення |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | | |
| 5 | | |
| 6 | | |
| 7 | | |

## Тэма 4. Слова. Вобраз. Тэма

Слова, дум ніхто не зв яжа.
*Янка Купала.*

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна падбіраць і вызначаць вобразную сістэму для напісання мастацкага твора.

Вобраз мастацкі — спецыфічная для мастацтва форма адлюстравання аб’ектыўнай рэчаіснасці з пазіцый эстэтычнага ідэала; канкрэтная і адначасова абагуленая карціна жыцця, створаная фантазіяй пісьменніка для адлюстравання пэўнай эстэтычнай ідэі. Увасабленне вобраза ў мастацкім творы ажыццяўляецца пры дапамозе розных сродкаў мастацтва (тропы, рытм і інш.).

Каб стварыць яркі вобраз у мастацкім творы неабходна прытрымлівацца наступных правіл.

1. Ніколі не забывайце, што вы індывідуальнасць, а значыць і ваш герой павінен быць індывідуальнасцю. Няхай той, каго вы апісваеце мае нейкую звычку, адметнае хобі…
2. Уключайцеся ў працэс.

Праца пісьменніка мае шмат агульнага з акцёрскім майстэрствам. Чытач, як і глядач, вельмі добра адчувае падман. Таму трэба ўвесь час быць «у вобразе» таго, пра каго ствараецца твор. Трэба ўвесь час мадэляваць сітуацыі ад імя свайго персанажа.

3. Прыдумайце, як увесц вобраз у твор (дзе і калі павінен з'явіцца персанаж у творы).
4. Выбірайце асобу апавядальніка. Калі вы хочаце расказаць асабістую гісторыю з упорам на пачуцці і ўнутраны свет, то лепш абраць першую асобу. Для стварэння лёгкага адчування аддаленасці падыдзе аповед ад трэцяй асобы. Абязлічанага апавядальніка лепш не выкарыстоўваць (гэта выглядае банальным), але калі вы ствараеце дзівака з дзіўным светапоглядам, то аддалены апавядальнік дасць добры эфект.
5. Вызначце пераломныя моманты ў жыцці персанажа.
6. Дайце персанажу ўнікальны голас: акцэнт, адметнае слова, наўмысна доўгія ці кароткія фразы і інш.

Праз вобразы раскрываецца тэма мастацкага твора. Гэта сукупнасць жыццёвых з'яў, якія адлюстроўваюцца ў мастацкім творы ў сувязі з пэўнымі праблемамі, што асэнсоўваюцца аўтарам. Тэма — абагуленая аснова любога мастацкага твора, тое, пра што ідзе гаворка. У творы можа быць адна дамінуючая тэма, а таксама некалькі дадатковых тэм. Сукупнасць тэм называецца тэматыкай. Тэматыка характарызуе творчасць пэўнага пісьменніка ці групы пісьменнікаў, творчасць пісьменніка ў пэўны перыяд яго творчасці. Тэма і ідэя характарызуюць змест твора і ўплываюць на яго форму (кампазіцыю).

### Заданне 13.

Уважліва прачытайце верш Ніны Мацяш «М. К. Чурлёніс. Дзень», а таксама карціну Мікалоюса Канстанцінаса Чурлёніса «Дзень» (малюнак 9). Падумайце, ці змагла паэтка перадаць вобраз Дня, якія сродкі выкарыстоўваюць мастак жывапісу і мастачка слова для стварэння аднаго і таго ж вобраза?

**М. К. Чурлёніс. Дзень**

Ніяк не ўстаць.
Ніяк не распрастацца.
У невядомасць цягне, бы ў смалу.
Але ўпіліся ў край планеты пальцы,
Усходзіць галавы цяжкой валун!
А за спіною —
Дзень таго не бачыць,—
Хай бачаць тыя, хто сустрэне Дзень! —
Як тайны вырыс Космасу,
Маячыць
Светлая постаць —
Часу пільны цень.
Ляжыць зямля пустынная, нямая.
Стварэнню свету йсці ў каторы раз!..
Глядзіць нам проста ў вочы, не міргае,
З засцерагальна ўзнятым пальцам
ЧАС.



*Мал. 9.* М. К. Чурлёніс. «Дзень»

**Заданне 14.**

Прааналізуйце верш Уладзіміра Караткевіча «Гусі-лебедзі ў лугах зялёных...». Вызначце тэму твора, як тэма ўплывае на вобразы. Якія выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы выкарыстоўвае паэт для стварэння вобразаў? Адказ аформіце ў выглядзе табліцы.

***

Гусі-лебедзі ў лугах зялёных,
Гладзяць крылы белыя блакіт.
Сокал, прагнучы крыві салёнай,
Рвецца у сакольніка з рукі.
Ногі коней грэбуюць зямлёю.
Ярасная сіла ў скакуне…
Адбылося гэта ўсё са мною,
Або гэта сон і яблынь снег.
Але ў сне не вып’еш столькі гора.
Ведаю, што я званіў у шчыт,
Я граміў татар пад Крутагор’ем,
Я крышыў крыжацкія мячы.
Кроў далі мне паплавы і пожні,
Голас — бор дрымучы і чарот.
Я з табою да крыві апошняй,
Мужны мой, адвечны мой народ.
Ты мне даў асеннія світанні,
Ты мне даў ружовы твар вясны,
Падарыў мне цяжкае каханне
Да жанчыны з дальняй стараны.
Роднымі зрабі чужыя вочы,
Шэрыя, як неба над табой,
А пасля пакліч, калі захочаш,

За цябе на самы страшны бой.
І калі ў твае глыбіні лягу, —
Дай мне ціхі спеў тваіх бяроз
За любоў, за веру, за адвагу
Сціплых песняў, што табе прынёс.

**Заданне 15.**

Успомніце якое-небудзь мерапрыемства, што праводзілася ў вашай установе адукацыі. На падставе гэтых успамінаў прыдумайце тры тэмы для апавядання(-яў). Вызначце, хто будзе галоўным персанажам гэтага твора (гэтых твораў). Свой адказ запішыце.

## Тэма 5. Анатацыя як форма прэзентацыі мастацкага твора

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна пісаць анатацыю.

Калі вы прыходзіце ў краму, то ў першую чаргу звяртаеце ўвагу на прыгожую незвычайную ўпакоўку. Кніга — таксама з'яўляецца таварам, ёй патрабуецца рэклама. Тут на дапамогу прыходзіць анатацыя — рэкламная аб'ява для вашых твораў. Таму пры напісанні анатацыі важна паказаць, што менавіта вы прадаяце і для каго прызначаецца ваш тавар, а таксама дайце гарантыі якасці.

*Як пісаць анатацыю?*

Пісьменнік Карэн С. Уізнер прапануе такую схему напісання анатацыі.

«Шкілет» анатацыі выглядае прыкладна так:

- дэкарацыі (дзе і калі адбываецца дзеянне?);
- уяўляем героя (хто ён такі? Чаму яго лёс павінен клапаціць чытача?);
- што герой губляе ці можа згубіць? Гэта «нешта» павінна быць вельмі важным для яго;
- уводзім пытанне (здолее ці не здолее герой вырашыць праблему?), «дражнім» чытача ці прыводзім рашэнне.

Вы таксама можаце запоўніць прабелы ў наступнай схеме:

_____________ хоча _____________, таму што ____________,
*(імя героя)* *(мэта)* *(матывацыя)*

але ён(а) сутыкаецца з______________________________.
*(перашкода на шляху да шчасця)*

Стварыўшы падобны чарнавік анатацыі, вы вырашыце першую задачу: апішаце, што за кнігу вы хочаце апублікаваць. Цяпер трэба перапрацаваць тэкст так, каб ён адпавядаў патрэбам вашай мэтавай аўдыторыі.

*Мэтавая аўдыторыя*

Калі вашы чытачы — гэта людзі з неразвітым літаратурным густам, то сказы ў анатацыі павінны быць кароткімі, без залішніх упрыгожванняў. Акцэнт робіцца на нешта сенсацыйнае, задзірлівае ці карыснае. Чытачу абяцаюцца простыя рэчы — смех, страх, перажыванні.

Калі мэтавая аўдыторыя — гэта людзі з высокімі патрабаваннямі да літаратуры, то акцэнт павінен быць зроблены на эстэтычным задавальненні, якое атрымае чытач. У дадзеным выпадку спрошчаная анатацыя можа «забіць» кнігу.

Адну і тую ж кнігу (твор) можна прадставіць па-рознаму:

*Гусляр адмаўляецца ад грошай, бо не мае намеру падпарадкавацца тым, хто пры ўладзе, але яго за гэта жорстка забіваюць. Чым закончылася гэта крывавая гісторыя?*

*Разбіраемся разам: чаму для гусляра ўласныя прынцыпы сталі важнейшымі за матэрыяльны дабрабыт і нават уласнае жыццё, чаму грошы не з'яўляюцца вымяральнікам шчасця.*

Як вы здагадаліся, гутарка тут ідзе пра паэму Янкі Купалы «Курган».

**Парады.**

Не выдавайце жаданае за сапраўднае. Калі на бульварным рамане будзе напісана «Новы Васіль Быкаў», то гэта спужае і эстэтаў, і не эстэтаў.

Калі трэба напісаць анатацыю на зборнік твораў, апішыце адзін з іх (або некалькі, калі гутарка ідзе пра вершы), а ніжэй укажыце, што гаворка ідзе пра зборнік.

Тыповыя памылкі пры напісанні анатацыі

Няма канкрэтыкі. *Гэта вельмі смешная кніга!*

Простая канстатацыя не дасць таго эфекту, які вы хочаце атрымаць. Пра смешную кнігу трэба напісаць смешна, пра рамантычную — рамантычна...

Непераканаўча. *Лявон Сабакін — адкрыццё на небасхіле сучаснай літаратуры. Яго апавяданні спалучаюць тонкую іронію, страх да дрыжыкаў і майстэрства апавядальніка.*

Такіх анатацый стала вельмі шмат, але рэальна яны не нясуць ніякай карыснай інфармацыі для чытача.

Няма гісторыі. *Восеньскі лес, калектыў дзяцей, нечаканы паварот падзей. Усё гэта вы знойдзеце ў гэтай кнізе, якую дачытаеце да апошняй старонкі.*

У гэтай анатацыі адсутнічае самае галоўнае: адказ на пытанне: «Пра што кніга?» Больш за тое, ёсць тут ціск на чытача *(вы дачытаеце да апошняй старонкі)*, што ніяк не дапушчальна.

**Заданне 16.**

У тэксце рубрыкі «Тэарэтычныя звесткі» прыведзены два ўзоры анатацыі на твор Янкі Купалы. Стварыце абагульнены партрэт патэнцыйнага чытача, які будзе выбіраць па гэтых анатацыях.

**Заданне 17.**

Напішыце анатацыю на ўласны зборнік твораў (калі ён ёсць або толькі плануецца). Улічыце адраснасць сваёй анатацыі.

## Тэма 6. Як не стаць графаманам

Творчы крызіс у графамана азначае, што ён ачуняў.
*Фазіль Іскандэр.*

**Плануемыя вынікі:** усведамленне небяспекі графаманства.

Ці сустракалі вы празаікаў і паэтаў, якія з'яўляюцца аўтарамі вельмі шмат доўгіх і вельмі нудных твораў. Такая «хвароба» называецца графаманствам.

Але гэты дыягназ успрымаецца надта крыўдна і абразліва. Трэба разумець, што значная колькасць вядомых пісьменнікаў на ранніх стадыях сваёй творчасці «перахварэла» на графаманію — пісаць шмат і хутка.

З вопытам прыходзіць разуменне, што тэкст патрабуе карпатлівай працы, а пісаць шмат зусім не абавязкова.

Адной з прымет графамана з'яўляецца навязванне ўласных твораў іншым. Пры гэтым да крытыкі і цвярозай самаацэнкі графаман не прыслухоўваецца, ён самазадаволены і самадастатковы. Гэты дакучлівы пісьменнік будзе актыўна прапаноўваць свае творы, не заўважаючы на яўную абыякавасць з вашага боку.

Графаманства шкодзіць, перш за ўсё, самому графаману, праўда, зразумець гэта ён часта не здольны. Інакш трэба альбо кінуць пісаць, альбо ставіцца да сваіх вершаў з большай патрабавальнасцю.

**!** *Дзесяць прыкмет графамана:*

1. Памылкі ў кожным сказе. Тэкст часта цытуюць, каб паказаць сэнсавыя і лагічныя ляпы. На ўказанне памылак аўтар адказвае: «Я аўтар, я так бачу!», «У мяне такі стыль!».
2. Апісанне чалавека выглядае прыкладна так: «У яго была галава, дзве рукі і дзве нагі. На галаве былі вушы, вочы, нос і рот. Левае вуха здавалася трохі большым за правае». Герой пазбаўлены імя, полу, характару.
3. У творы апісваецца тое, пра што пісьменнік не мае ніякага ўяўлення.
4. З твора ў твор пераходзіць адзін і той жа жарт, прыём.
5. Фінал твора можна прадказаць пасля прачытання першага абзаца.
6. Падчас чытання твора чытача не пакідае ўражанне, што гэта ён ужо некалькі разоў чытаў.
7. Ніякая крытыка для графамана не будзе прымальнай.
8. Графаман лічыць, што піша для сябе, але пры гэтым прымушае ўсіх вакол хваліць яго творы.
9. Графаман лічыць неабходным вучыць іншых пісаць творы.
10. Графаман сам не чытае ўласныя творы. Перастае з імі працаваць, калі паставіў апошнюю кропку.

Графаманіі супрацьпастаўлены талент.

**!** *Дзесяць прыкмет таленавітага аўтара:*

1. Твор дачытваецца чытачамі без прымусу да канца.
2. Таленавіты аўтар не саромеецца правіць свой тэкст нават тады, калі твор ужо выйшаў з друку.
3. Чытачы пакідаюць водгукі. Нават калі гэта водгукі адмоўныя: значыць, зачапіла!
4. З'яўляюцца рэцэнзіі вядомых крытыкаў.
5. Твор не падобны ні на які іншы.
6. Людзі абмяркоўваюць твор за кубачкам чаю.
7. Цытаты з твораў таленавітага аўтара «ідуць у народ».
8. На таленавіты твор пішуцца фанфікі[1] або твор у адказ.
9. Таленавіты твор хочацца перачытаць.
10. Таленавіты аўтар заўсёды вучыцца.

---

[1] Фанфік — аматарскае сачыненне па матывах папулярнага твора.

**Заданне 18.**

Падзяліце аркуш паперы на дзве часткі. З левага боку напішыце, што станоўчага нясуць графаманы грамадству, а з правага — што адмоўнага. Ніякі бок ліста не павінен застацца чыстым. Параўнайце сваю працу з працай сваіх аднакласнікаў. Вылучыце, якія пазіцыі ў вас атрымаліся агульныя. Пры неабходнасці дадайце свой спіс станоўчага і адмоўнага.

## Тэма 7. Ад натхнення да твора

Гуслям, княжа, не пішуць законаў.
*Янка Купала.*

**Плануемыя вынікі:** уменне пісаць мастацкія творы па зададзеных параметрах.

Мусіць кожны чалавек у сваім жыцці адчуваў неабходнасць нешта напісаць. Часам гэтую неабходнасць успрымаюць за натхненне. Але гэта не зусім так. Бывае, што хочацца камусьці зрабіць прыемнае на дзень нараджэння — «сплёў» рыфму — вось і вершык, прачытаў пра драматычную падзею ў газеце — гатова замалёвачка, убачыў недахоп на вуліцы — «накрэмзаў» паэмку. Уменне складаць словы ў радкі і прыдумваць рыфмы — гэта яшчэ не натхненне, гэта забава для душы.

А бывае, што знаходзішся пад якім-небудзь уражаннем (а можа і зусім без яўных прычын) на цябе сыходзіць нейкая хваля, якая поўнасцю паглынае. І з'яўляюцца незвычайныя вобразы, усе іншыя справы адыходзяць на другі план. І свет становіцца не такім, якім быў да гэтага часу:

А верш адпачынку не просіць,
Імкнецца да лепшых людзей.
*П. Панчанка.*

**Заданне 19.**

Вы ўжо шмат чаму навучыліся, але для таго, каб стаць сапраўдным пісьменнікам трэба шмат працаваць, увесь час практыкавацца ў напісанні мастацкіх твораў. Вам прапануецца выканаць серыю практыкаванняў, якія дапамогуць развіваць творчыя здольнасці. Не пужайцеся, што практыкаванняў шмат. Іх можна выконваць паступова, можна адкладаць выкананне, а потым вяртацца да іх выканання. Калі палічыце патрэбным, то некаторыя практыкаванні выконвайце разам з аднакласнікамі.

1. Уключыце дыктафон, перакажыце вядомую казку (напрыклад, «Піліпка-сынок»). Праслухайце запіс.
2. Запішыце 15 слоў на літару ***н***. Падбярыце сінонім і антонім да кожнага.
3. Паглядзіце, што адбываецца за акном на вуліцы. Пасля, не адрываючы вачэй ад манітора ці ліста, паспрабуйце запісаць усё, што бачылі.
4. Апішыце свой адказ на адным з урокаў ад імя настаўніка.
5. На працягу тыдня кожную раніцу пішыце пра світанне. Паспрабуйце не паўтарацца.
6. Запішыце 10 выпадковых слоў. Складзіце асэнсаваны тэкст з імі.
7. Не выкарыстоўваючы займеннікі «я», напішыце пра сябе і свой звычайны дзень.

8. Прыдумайце 5 новых слоў. Складзіце з гэтымі словамі міні-тэкст. Прачытайце гэты тэкст сваім бацькам і таварышам. Ці зразумелі вашы чытачы (слухачы) сэнс новых слоў?
9. Апішыце восеньскі лес, не выкарыстоўваючы прыметнікаў.
10. Уважліва прачытайце ўласны мастацкі твор. Выпішыце з яго цытаты, якія вам падабаюцца. Калі вы яшчэ нічога не напісалі, вазьміце тэкст вашага таварыша.
11. Падбярыце да слова «каханне» 30 асацыяцый: слоў, афарызмаў, імёнаў, песень і інш.
12. Апішыце чалавека, які выклікае ў вас сімпатыю. У вашым апісанні павінна быць роўна 1000 знакаў.
13. Апішыце чалавека, які выклікае ў вас антыпатыю. Пры апісанні нельга выкарыстоўваць словы з негатыўным значэннем.
14. За 15 хвілін намалюйце 10 карцінак. Падпішыце кожную з іх.
15. «Пачулася рыпенне падлогі». Гэта пачатак вашага будучага твора. Напішыце тры мастацкія творы: а) страшная містычная гісторыя; б) рамантычны верш; в) бытавая замалёўка.
16. Знайдзіце ў сеціве 5 выпадковых фотаздымкаў. Пішыце пра кожнага чалавека так доўга, як зможаце. Прыдумайце імя гэтаму чалавеку, яго біяграфію.
17. Складзіце 5 сказаў, у кожным з іх 5 слоў, адно з іх «малы». У кожным сказе пазіцыю слова «малы» трэба змяняць: у першым сказе яно павінна быць першым, у другім сказе — другім і г.д.
18. Дайце волю сваёй фантазіі. Апішыце сустрэчу Янкі Купалы з вашым любімым сучасным пісьменнікам (айчынным ці замежным). Пра што яны маглі б пагаварыць?
19. Прыдумайце пяць воклічаў, сінанімічных «Нічога сабе!»
20. Перакладзіце верш беларускага пісьменніка на замежную мову, якую вывучаеце. Калі не атрымліваецца захаваць вершаваны памер і рытм, то перакажыце верш прозай, захаваўшы ідэю твора.
21. Апішыце свой пакой ад асобы невідушчага чалавека.
22. Уявіце, што хатняя жывёла можа гаварыць. Напішыце замалёўку пра дзве гадзіны жыцця ад імя хатняй жывёлы.
23. Напішыце ліст сабе ў мінулае і ў будучае.
24. Пастаўце таймер (будзільнік) на 15 хвілін. За гэты час запісвайце ўсё, што прыйдзе ў галаву. Пасля 15 хвілін спыніцеся. Прачытайце, што атрымалася.
25. Напішыце апавяданне (верш) пра значную падзею ў сваім жыцці.

## Тэма 8. Літаратурная крытыка

Мастаку няма калі слухаць крытыку. Хто хоча стаць пісьменнікам, чытае рэцэнзіі, хто хоча пісаць, не мае часу чытаць рэцэнзіі.

*Уільям Фолкнер.*

**Плануемыя вынікі:** усведамленне ролі крытыкі для мастака і мастацтва.

Добры крытык — гэта вялікая рэдкасць. Ад яго чакаюць аб'ектыўнай ацэнкі мастацкага твора. Сапраўдны крытык ніколі не скажа толькі «мне

падабаецца» ці «мне не падабаецца», ён абавязкова патлумачыць, чаму. Заўвагі крытыка павінны стымуляваць пісьменніка, а не расчароўваць.

Занадта хваравіта рэагаваць на крытыку не варта. Пісьменнік, які ад любога няўхвальнага слова ўпадае ў роспач і бяжыць паліць свае творы, ніколі не стане самастойным і арыгінальным творцам. Вядома, нават справядлівую крытыку слухаць непрыемна. Але слухаць яе трэба. У вас заўсёды будзе час падумаць — згаджацца з крытыкай ці не. Бывае, што з першага разу заўвагі здаюцца вам прыдзіркамі, але, падумаўшы, вы прымаеце іх і выпраўляеце тэкст. Урэшце, калі ваш твор нікому не спадабаўся, а вы адчуваеце, што ён добры, не здавайцеся — шукайце свайго чытача.

Ацэньваць працу мастака значна цяжэй, чым працу, напрыклад, фізіка або біёлага. У навуцы прасцей — тэорыя або вынаходніцтва альбо працуюць, альбо не працуюць. А вось ўспрыманне твораў мастацтва моцна залежыць і ад асобы аўтара, і ад меркавання крытыкі, і ад настрояў большасці людзей.

**Вылучым асноўныя прынцыпы напісання крытычнай рэцэнзіі:**

**Палярнасць** вашага выкладу. Неабходна, каб вы паказалі не толькі недахопы твора, але і яго відавочныя (або схаваныя) моцныя бакі. Паверце, яны ёсць у кожным тэксце. Усё залежыць толькі ад таго, ці гатовыя вы іх убачыць.

**Аб'ектыўнасць.** Трэба адкінуць эмацыянальны бок: кожнае выказванне павінна быць падмацавана пэўнымі доказамі-аргументамі.

**Фактычнасць.** Любое меркаванне павінна грунтавацца на рэальных фактах, а не на дадумках і галаслоўных абвінавачваннях. Для аргументацыі важна карыстацца ведамі па тэорыі літаратуры, вывучанымі законамі развіцця мовы.

**Шырыня аналізу.** Разглядайце твор з розных бакоў. Трэба імкнуцца спасцігнуць аўтарскую задуму, паставіць сябе на месца аўтара.

**Рэфлексія.** Крытык павінен адэкватна ацэньваць свае магчымасці і здольнасці. Перш чым рэзка асуджаць ці даваць дакучлівыя рэкамендацыі неабходна адказаць на пытанне: «А ці маю я на гэта права?» Задача крытыка дапамагчы, а не знішчыць аўтара.

**Выключэнне прамалінейнасці і адназначнасці.** Добры крытык заўсёды пакідае месца для свабоды думкі і для палемікі.

Чаго не варта рабіць, калі селі пісаць рэцэнзію?

- ✓ Праяўляць залішнюю арыгінальнасць. Крытыка — гэта адказна, таму трэба прытрымлівацца пэўных правіл.
- ✓ Быць бесцырымонным. Паважайце таго, чый твор рэцэнзуеце. Нават тады, калі твор вас раздражняе. Аўтар — гэта не ваш бліжэйшы сябар, таму звяртацца да яго трэба паблажліва.
- ✓ Займацца падрабязным пераказам. Ваша задача — раскрыць змест, а не выкласці яго па-свойму.
- ✓ Займаць адназначную пазіцыю. Трэба выказваць сваю пазіцыю, але пакідаць магчымасць для палемікі. Вы маеце права на сваё меркаванне, але пры гэтым нельга выдаваць яго за толькі правільнае. Будзьце далікатным крытыкам.
- ✓ Замяняць рэцэнзію водгукам. Рэцэнзія патрабуе падрабязнага аналізу. Вы павінны звярнуць увагу на назву твора, даследаваць яго кампазіцыю і

структурныя кампаненты. Спыніцеся асобна на героях. Даследуйце аўтарскі стыль. Суаднясіце форму і змест, разгледзьце пэўныя дэталі і не забудзьцеся пра агульны погляд на тэкст.

✓ Быць няўважлівым да моўнага афармлення. Калі вы ўзяліся за крытыку, то неабходна сачыць за ўласным вусным і пісьмовым маўленнем.

**Заданне 20.**

Уважліва прачытайце крытычны артыкул у адным з літаратурна-мастацкіх часопісаў (напрыклад, «Полымя»), адзначце, што спадабалася, а што не спадабалася ў гэтым артыкуле.

**Заданне 21.** Міні-праект (у групе)

Размяркуйце паміж сабой розныя аспекты аналізу мастацкага твора, якія вы ўсе разам прачыталі. Абмяркуйце вынікі сваёй працы ў групе.

**Заданне 22.** Міні-праект (індывідуальны)

Дайце прачытаць некалькі сваіх твораў блізкім людзям і папрасіце іх ацаніць рукапіс па наступных параметрах:

- ці выклікаў твор цікавасць, зыходзячы з анатацыі (іншага рэкламнага тэксту);
- узровень моўнага афармлення;
- ці цікава было сачыць за развіццём тэмы (для лірыкі) / сюжэту (для сюжэтных твораў);
- наколькі проста было сачыць за развіццём тэмы/сюжэта, ці няма адчування блытаніны;
- ці з'яўляецца тэмп твора прымальным (магчыма, адчуваецца зацягнутасць або залішняя паспешлівасць);
- наколькі прывабнымі паўстаюць вобразы ў творы;
- наколькі новыя ідэі прадстаўлены ў творы / новая інтэрпрэтацыя;
- ці парэкамендавалі б прачытаць іншым людзям;
- агульная ацэнка твора па 10-бальнай шкале.

Вынікі апытвання могуць стаць фундаментам для напісання крытычнай рэцэнзіі.

## Тэма 9. Афармленне зборніка мастацкіх твораў

Кожную кнігу трэба пісаць так, нібы гэта твая лепшая і апошняя.

*Уладзімір Караткевіч.*

**Плануемыя вынікі:** знаёмства з працай па афармленні зборніка мастацкіх твораў; уменне самастойна падбіраць дызайн кнігі.

Як бы не развіваўся прагрэс, любому пісьменніку цікава патрымаць у руках сапраўдную кніжку, выдадзеную ў друкарні. Што трэба зрабіць, каб кніга пабачыла свет? Мы будзем гаварыць пра зборнікі твораў аднаго ці некалькіх аўтараў.

Пачнём з дызайну. Традыцыйна зборнікі маюць невялікі фармат — звычайна 120x170 або 100x140 мм., вокладка можа быць як цвёрдай (яе можна зрабіць толькі ў прафесійнай друкарні), так і мяккай (яе можна зрабіць і на аматарскім абсталяванні).

Афармленне вокладкі — гэта вельмі важна, праз яе адбываецца знаёмства са зместам твора, яна часта служыць аргументам для чытача купіць ці не купіць кнігу. Адказнасць за вокладку ляжыць на тым, хто займаецца дызайнам, і аўтары. Калі адсутнічае арыгінальная ідэя вокладкі, то не трэба змяшчаць на ёй банальныя сімвалы (напрыклад, сімвалы паэзіі: Пегас, пяро, восеньскае лісце), лепш падаць толькі назву і імя аўтара (аў), можна пагуляць са шрыфтамі, размяшчэннем літар.

Вы ведаеце, што пісьменнікі нярэдка бяруць сабе псеўданім. Ці ісці гэтым шляхам — вырашаць вам, але калі вырашыце браць псеўданім, то павінны быць важкія прычыны: вядомасць у сетцы Інтэрнэт пад пэўным нікам, жаданне пазбегнуць блытаніны са знакамітым цёзкам або сваяком, нежаданне, каб родныя і блізкія даведаліся пра выхад кнігі

На прасторы ўнутры зборніка лепш не эканоміць. Калі гэта зборнік вершаў, то лепш размяшчаць іх на асобных старонках, нават калі гэта хоку ці монаверш.

У канцы твора пажадана ставіць дату. Па-першае, гэта выразнае пазначэнне канца тэксту, а па-другое, дазваляе ўявіць сабе час, калі быў напісаны твор.

Вельмі добра, калі ў зборніку будуць змешчаны кароткія звесткі пра аўтараў. Чытач зможа ўявіць, наколькі твор набліжаны да рэальных будняў пісьменніка.

Вельмі добра, калі зборнік будзе мець уступны і/ці завяршальны крытычны артыкул. Гэта значна аблегчыць працу чытача.

Пры неабходнасці будзе не лішнім забяспечыць свае творы філалагічнымі, гістарычнымі ці культуралагічнымі каментарыямі. Не кожны чытач, на жаль, пацягнецца да даведнікаў, каб удакладніць значэнне слова, даведацца пра падзеі, якія ляглі ў аснову твора. Каментарыі могуць быць унізе старонкі, але лепш за ўсё размяшчаць іх у канцы зборніка, каб не загружаць твор і не адцягваць увагу больш дасведчанага чытача.

Што тычыцца зместу, то акрамя традыцыйнага — пастаронкавага — добра было б мець дадатковы — алфавітны — які значна аблягчае пошук патрэбнага твора, як чытачу, так і аўтару.

Пры афармленні нельга злоўжываць ілюстрацыямі і эксперыментамі са шрыфтамі, арнаментамі. Гэтыя элементы афармлення не павінны адцягваць увагу чытача ад мастацкага твора.

Немалаважнае значэнне мае парадак размяшчэння твораў у кнізе. Пры адборы пажадана прыслухоўвацца да ўласнай інтуіцыі, але прыслухацца і да парад аўтарытэтных сяброў і рэдактараў. Чарговасць вершаў, вядома, цалкам на сумленні складальніка і рэдактара, але і тут можна даць некаль парад.

1. Творы друкуюцца ў храналагічным парадку, дзякуючы чаму чытач можа прасачыць паэтычную эвалюцыю, а зборнік стане своеасаблівым гістарычным дзённікам.
2. Творы групуюцца па родах і жанрах. Дапусцім, лірыка, байкі, хайку, эпіграмы, паэмы, апавяданні і г. д.; пачынаць лепш з твораў «малой» формы.

3. Творы групуюцца па тэмах або цыклах (калі такія маюцца). Напрыклад, творы пра прыроду, пра каханне, грамадзянскія, сатырычныя і да т. п.
4. Калі ж вы, наадварот, баіцеся змарыць чытача аднастайнасцю, зрабіце змешаны варыянт. Гэта значыць, разумна чаргаваць паміж сабой творы розных жанраў і тэм, рознага ўзроўню складанасці і рознага аб'ёму. Накшталт таго, як на музычным дыску павольныя песні змяняюцца больш хуткімі, а лёгкія — цяжкімі. Разумна такі зборнік даць пачытаць людзям, якім вы давяраеце, бо ёсць небяспека яго перагрузіць.

Які шлях вы выберыце залежыць толькі ад вас.

Перад непасрэдным выданнем зборніка пажадана папрасіць пісьменнага чалавека прагледзець вёрстку свежым поглядам і выправіць дапушчаныя памылкі. Далёка не ўсе асаблівасці арфаграфіі, пунктуацыі і графічныя прыёмы паэта могуць быць зразуметыя карэктарам, таму праўкі абавязкова трэба ўзгадняцца з аўтарам.

І самае галоўнае: пры стварэнні зборніка важна захаваць павагу і да аўтара, і да тэксту, і да чытача.

**Заданне 23.**

Прадумайце канцэпцыю ўласнага зборніка мастацкіх твораў: што будзе на вокладцы, ці будзеце вы выкарыстоўваць унутранае аздабленне старонак, хто напіша ўступны (заключны) артыкул, які прынцып размяшчэння твораў вам найбольш падабаецца, каго вы папросіце быць рэдактарам і карэктарам.

## Тэма 10. Прэзентацыя зборніка мастацкіх твораў

Калі я чытаю добрую кнігу, не папракайце мяне ў гультайстве. Не хочаце прызнаць, што я працую, дык думайце, што я малюся — Слову.
*Янка Брыль.*

**Плануемыя вынікі:** уменне прэзентаваць вынік сваёй працы.

Прэзентацыю зборніка мастацкіх твораў можна праводзіць у розных месцах: бібліятэках, музеях і інш.

Як запрасіць чытачоў на прэзентацыю?

Як правіла, трэба вызначыць, калі большасць тых, каго вы плануеце запрасіць, будзе мець вольны час і магчымасць наведаць прэзентацыю. Запрашаць лепш патэнцыяльных чытачоў, тых, для каго напісана кніга. Пажадана своечасова падрыхтаваць вялікую ўрачыстую аб'яву і асабістыя запрашэнні для vip-гасцей. Эфектыўна будзе распаўсюджваць аб'яву пра прэзентацыю праз сацыяльныя сеткі.

Якія арганізацыйныя моманты трэба ўлічыць?

Неабходна раней вызначыць вядучага, напісаць сцэнарый. Перад пачаткам прэзентацыі лепш праверыць, ці падрыхтаваны месцы для ўдзельнікаў прэзентацыі.

Для ўдзельнікаў прэзентацыі можна падрыхтаваць невялікія сувеніры: закладкі для кніг, флаеры і інш. з апісаннем і анатацыяй зборніка, звесткамі пра аўтараў.

Аўтары зборніка, якія ўдзельнічаюць у прэзентацыі, павінны быць падрыхтаваны да адказаў на самыя простыя і складаныя пытанні: «Пра што кніга?», «Чаму кніга так называецца?» і інш. Адказы павінны быць простымі і лаканічнымі. Вельмі карысна выкарыстоўваць на прэзентацыі чытацкія водгукі.

У час прэзентацыі пажадана запланаваць аўтограф-сесію, падчас якой можна таксама пагутарыць з чытачамі.

Як раздаваць аўтографы?

Калі падпісваеце кнігу, заўсёды пытайцеся, ці жадае чытач, каб аўтограф быў імянны. Калі вы не ўпэўненыя, як пішацца імя або прозвішча таго, каму падпісваеце кнігу, удакладніце. Паспрабуйце прыдумаць нейкую арыгінальную фразу, каб ваш надпіс не быў безаблічным.

Фатаграфуйцеся з чытачамі на свой тэлефон: многія з іх таксама захочуць зрабіць здымак, а потым выкласці яго ў сацсеткі.

# 11 клас

# МОДУЛЬ 3
# Публічныя тэксты

## Тэма 1. Крэалізаваныя тэксты і іх інтэрпрэтацыя

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна складаць крэалізаваныя тэксты.

Крэалізацыя як працэс уяўляе сабой злучэнне двух і болей спосабаў перадачы інфармацыі. Крэалізаваныя тэксты складаюцца з вербальнага тэксту і ілюстрацыйных элементаў (гэта не толькі малюнкі і фатаграфіі), пры гэтым адзін складнік не можа існаваць без другога. Калі выключыць з крэалізаваных тэкстаў ілюстрацыйную частку, то тэкст перастане існаваць. У лепшым выпадку ён будзе пазбаўлены нейкіх эмацыянальных афарбовак, глыбіні зместу ці інакш інтэрпрэтавацца. У горшым выпадку тэкст перастане перадаваць інфармацыю, не будзе закончаным выказваннем. Прыкладамі крэалізаваных тэкстаў з’яляюцца: рэклама, афіша, комікс — ілюстрацыя і тэкст, рэкламны відэаролік — тэкст, ілюстрацыя, музыка.

Пры стварэнні крэалізаваных тэкстаў важна, каб і малюнак, і суправаджальны яго тэкст перадавалі адну і тую ж думку, узаемадапаўнялі адзін аднаго.

Самы просты спосаб гэтага дамагчыся — падабраць ілюстрацыю, цалкам адпаведную слову (аднаму са слоў у тэксце або адзінаму слову).

Сэнсавая сувязь можа ажыццяўляцца не толькі па прамых значэннях слоў ці малюнкаў, але і з дапамогай розных асацыяцый:

Сярод сродкаў, пры дапамозе якіх ствараюцца крэалізаваныя тэксты, трэба назваць шрыфт, колер, фон тэксту (каляровы або ілюстраваны), сродкі арфаграфіі, пунктуацыі і словаўтварэння, іканічныя друкаваныя сімвалы (піктаграмы, ідэаграмы і інш.), графічнае афармленне вербальнага тэксту (у выглядзе фігуры, у слупок і пад.)

**Заданне 1.**

Разгледзьце прыклады крэалізаваных тэкстаў і растлумачце, з якой мэтай і на каму яны адрасавы. Вызначце сродкі, пры ўзаемадзеянні якіх ствараецца адзінае цэлае.





















**Заданне 2.**

У Беларусі ствараецца вялікая колькасць малочнай прадукцыі. Кожны вытворца імкнецца данесці да спажыўца інфармацыю пра ўнікальнасць сваіх прадуктаў. Уважліва разгледзьце некаторыя малочныя брэнды і патлумачце, на каго разлічана гэта прадукцыя, што́ імкнуўся данесці вытворца і што́ можна было б паправіць, каб брэнд стаў больш зразумелым. Адказ прадстаўце ў выглядзе табліцы.

| ТЕКСТ 1 | ТЕКСТ 2 | ТЕКСТ 3 |
|---|---|---|
| Брест-Литовск · 1795 · ЗНАТНЫЙ ПРОДУКТЪ | ЛЮБИМЫЙ ВКУС · Минская марка · С 1929 ГОДА | Віцебскае малако |
| **ТЕКСТ 4** | **ТЕКСТ 5** | **ТЕКСТ 6** |
| Бабушкина крынка | МОЛОЧНАЯ ПЧЕЛА | Молочный Мир · сила молока |

**Заданне 3.**
Прааналізуйце тэатралізаваныя афішы як крэалізаваныя тэксты.







## Тэма 2. Рэкламны тэкст

Лягчэй скласці дзесяць правільных санетаў, чым добрую рэкламу.
*Олдас Хакслі, англійскі пісьменнік.*

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна складаць рэкламныя тэксты.

Рэкламныя тэксты — гэта тэксты, накіраваныя на прасоўванне або прэзентацыю тавараў, паслуг, ідэй з мэтай павелічэння іх збыту. Артыкул ў часопісе, тэкст радыёроліка або відэарэкламы, апісанне тавару на ўпакоўцы, тэкст на картцы тавару ў інтэрнэт-краме — усё гэта прыклады рэкламных тэкстаў.

**Асаблівасці рэкламных тэкстаў:**

- ✓ Лаканічнасць. Простыя сказы і абзацы.
- ✓ Канкрэтыка. Адсутнасць лірычных адступленняў, разваг, апісанняў агульнавядомых фактаў.
- ✓ Прастата лексікі. Мова рэкламы бліжэй хутчэй да гутарковай гаворкі, чым, напрыклад, да навуковага стылю.
- ✓ Зварот да чытача. Замест «мы» і «наш» выкарыстоўваецца «вы» («ты») «ваш». Галоўная задача — растлумачыць, што пакупнік атрымае ад прадукту. Тэкст будуецца з пункту гледжання выгод для спажыўца.
- ✓ Адна цэнтральная ідэя. Рэкламны тэкст даносіць да чытача ўсяго адну думку.
- ✓ Арыгінальнасць. Для тэксту рэкламы непрымальныя клішэ, канцылярызмы. Тэкст павінен прыцягваць і ўтрымліваць увагу чытача — а значыць, быць цікавым.
- ✓ Наўмыснае парушэнне граматычных норм. Дапускаецца спецыяльна парушаць правілы для стварэння вызначанага эфекту.
- ✓ Вобразнасць. Для рэкламы характэрна імкненне ствараць у свядомасці чытача пэўныя адчуванні, выявы, эмоцыі.

## Віды рэкламных тэкстаў

У літаратуры можна сустрэць розныя класіфікацыі рэкламных тэкстаў. Сустракаецца дзяленне рэкламы на інфарматыўную, параўнальную, напамінальную.

***Інфарматыўная рэклама.*** Яе задача — фарміраванне першаснага попыту, запамінанне спажыўцом брэнда і ключавой перавагі тавару.

Marko
ОБУВЬ И АКСЕССУАРЫ

***Напамінальная.*** Яе задача — не «прадаць прадукт тут і цяпер», а пераканаць пакупніка, які раней ужо набываў тавары ці паслугі, што ён зрабіў правільны выбар. Інакш кажучы, каб пакупнік і надалей карыстаўся дадзенымі таварамі / паслугамі.




***Параўнальная рэклама.*** У ёй падрабязна тлумачацца перавагі тавара. Могуць выкарыстоўвацца меркаванні экспертаў, аўтарытэтных асоб (узгадайце рэкламу пральнага парашку).

Асобна можна вылучыць *сацыяльную рэкламу*, якая накіравана на змену мадэлей сацыяльных паводзін і прыцягненне ўвагі да значных для грамадства з’яў і праблем.




## Структура рэкламных тэкстаў

1. Загаловак
2. Падзагаловак
3. Асноўны тэкст
5. Слоган

**Заданне 4.**

Згодна з вынікамі рэкламнага даследавання, «чароўнымі» словамі любога рэкламнага тэксту з'яўляюцца:

- новы;
- сёння;
- унікальны;
- бясплатна;
- дзіўны;
- хуткі;
- распродаж;
- просты;
- упершыню.

Падбярыце па два сінонімы да кожнага ўзгаданага вышэй слова.

**Заданне 5.**

Выкарыстоўваючы «чароўныя» словы паспрабуйце скласці рэкламу кафэ-магазіна, дзе плануецца продаж кніг, настольных і інтэлектуальных гульняў. Акрамя гэтага ў кафэ-магазіне можна бавіць час за цікавай кнігай з кубкам кавы або чаю.

**Заданне 6.**

Падрыхтуйце рэкламу і афішу плануемага фестывалю сацыяльнай рэкламы.

## Тэма 3. Фестываль сацыяльнай рэкламы

**Фестываль** — гэта свята, паказ дасягненняў музычнага, тэатральнага, эстраднага, цыркавога ці кінамастацтва, а таксама спартыўных дасягненняў.

**Віды фестываляў**

1. Па відах мастацтва (кінафестывалі, фестывалі тэатральнага мастацтва, фестывалі фотамастацтва, музычныя фестывалі, фестывалі выяўленчага мастацтва і г. д).
2. Па храналагічным прынцыпе (штогадовыя, біенале (раз у два гады), трыенале (раз у тры гады).
3. Па тэорыі ахопу (рэгіянальныя, міжнародныя, рэспубліканскія).
4. Па складзе ўдзельнікаў (фестывалі дзіцячай творчасці, прафесійныя, аматарскія, маладзёжныя).
5. На конкурснай аснове і без яе.
6. Звязаныя з развіццём новых тэхналогій.

**Заданне 7.**

Складзіце топ-10 фестываляў, якія праходзяць у тваёй школе, мясцовасці, краіне.

**Заданне 8.**

Правядзіце фестываль сацыяльнай рэкламы (папулярызацыя здаровага ладу жыцця, грамадскіх арганізацый і фондаў, мэтай якіх з'яўляецца дапамога людзям, у прыватнасці, дзецям; падтрымка неабароненых пластоў насельніцтва; барацьба з забруджваннем навакольнага асяроддзя).

# МОДУЛЬ 4

# Дзелавыя тэксты

## Тэма 1. Дзелавыя тэксты: мэта, структура, прызначэнне

Дзелавыя тэксты абслугоўваюць адносіны, якія ўзнікаюць паміж органамі дзяржавы, паміж арганізацыямі або ўнутры іх, паміж арганізацыямі і прыватнымі асобамі ў працэсе іх дзейнасці. Мова данных дакументаў характарызуецца дакладнасцю фармулёвак, безасабовасцю і сухасцю выкладу, высокай стандартнасцю, вялікай колькасцю ўстойлівых зваротаў, клішэ.

**Заданне 9.**

Стартавай пляцоўкай для выступлення пачынаючых музычных калектываў, артыстаў, паэтаў і пісьменнікаў часта становяцца арт-кафэ. Уявіце сябе адным з уладальнікаў арт-кафэ «Рэха», у якім запланавана арганізацыя мерапрыемстваў для маладых паэтаў.

*Арт-кафэ — тэматычная ўстанова грамадскага харчавання, якая прапануе наведвальнікам не толькі звычайную ежу, а яшчэ і «духоўную». Гэта свайго роду клуб па інтарэсах, дзе можна не толькі смачна паесці, але і пагутарыць з аднадумцамі, вядомымі (знакамітымі) людзьмі ва ўтульнай абстаноўцы.*

Складзіце пералік (спіс) найбольш значных дзелавых папер, неабходных для набору персаналу, рэкламы адкрыцця кафэ.

Гэты спіс ляжа ў аснову альбома дзелавых тэкстаў.

## Тэма 2. Аб’явы

**Плануемыя вынікі:** уменне правільна складаць аб’явы.

**Аб’ява** — гэта адзін з відаў дзелавых папер, прызначэннем якога з’яўляецца паведамленне аб якіх-небудзь падзеях, мерапрыемствах, якія тычацца пэўнай групы людзей.

Аб’явы складаюцца па такім плане:

1) да каго звернута аб’ява;
2) што паведамляецца ў аб’яве;
3) дзе і калі будзе адбывацца тое, пра што гаворыцца ў аб’яве;
4) ад чыйго імя напісана аб’ява.

Аб’ява павінна быць нешматслоўнай, дакладнай, зразумелай, у ёй павінна паведамляцца асноўнае. Дату, назву мерапрыемства можна прыгожа аформіць, каб аб’ява звяртала на сябе ўвагу.

Па змесце аб’явы могуць быць самымі разнастайнымі і складацца ад імя арганізацый, устаноў, прыватных асоб.

Аб’явы друкуюцца ў газетах, інтэрнэце, размяшчаюцца на вулічных білбордах, дошках аб’яў, перадаюцца па радыё, трансліруюцца па тэлебачанні.

УВАГА!
Сёння ў скверы адбудзецца адкрыццё мастацкай галерэі «Проба пяра»!




**Заданне 10.**

Азнаёмцеся з аб’явамі. Вызначце тэму. Укажыце, з дапамогай якой маўленчай формулы прыцягваецца ўвага. Якія маўленчыя сродкі выкарыстоўваюцца, каб зацікавіць адрасата? Як заканчваецца аб’ява?

**Заданне 11.**

Складзіце некалькі аб’яў для размяшчэння ў розных сродках масавай інфармацыі аб адкрыцці арт-кафэ «Рэха», аб’яву аб наборы персаналу.

**Заданне 12.**

Уявіце сабе, што Вы дырэктар выдавецтва «Доктар Ватсан», якое збіраецца выдаваць дэтэктывы. З усіх рэсурсаў Вам не хапае толькі людзей. Якіх спецыялістаў неабходна наняць, якімі кампетэнцыямі яны павінны валодаць. Сфармулюйце адказ у выглядзе аб’явы ці серыі аб’яў аб прыёме на работу.

Трэба ўлічваць, што выдавецтва займаецца падрыхтоўкай да выдання кніг, іх афармленнем і продажам, друкаваннем можа займацца і іншая арганізацыя.

## Тэма 3. Пісьмы ў дзелавой сферы

**Плануемыя вынікі:** уменне самастойна складаць пісьмы, неабходныя для наладжвання афіцыйных зносін і перадачы інфармацыі.

**Пісьмо** — гэта спосаб зносін і перадачы інфармацыі, накіраванай на захаванне, спыненне, аднаўленне і наладжванне адносін з партнёрамі, супрацоўнікамі.

Напісаць пісьмо правільна, не ведаючы патрабаванняў, правіл, вельмі складана.

Адзінай класіфікацыі пісем няма, гэта абумоўлена хуткім эканамічным развіццём і ўзрастаннем неабходнасці перадачы інфармацыі паміж партнерамі, супрацоўнікамі, пакупнікамі і г. д. Пісьмы перасылаюцца поштай, аднак на

сённяшні дзень самым распаўсюджанным сродкам перадачы дзелавой перапіскі з'яўляецца электронная пошта. Масавасць выкарыстання дзелавых пасланняў прывяла да павелічэння іх разнавіднасцей. Можна выдзеліць наступныя віды пісем:

***Апавяшчэнне (інфармацыйнае пісьмо).*** Распавядае адрасату аб якой-небудзь інфармацыі. Такое пісьмо не патрабуе адказу. Напрыклад, вы валодаеце інтэрнэт-магазінам і паведамляеце, што заўтра апошні дзень скідак або поўная змена асартыменту.

***Гарантыйныя.*** У такіх пісьмах даюцца гарантыі ў выкананні абавязацельстваў: зробіце працу ў тэрмін, заплаціце за паслугу, прывезяце тавар у тэрмін і гэтак далей.

***Суправаджальнае пісьмо.*** Выкарыстоўваецца часцей за ўсё пры адпраўцы пакета дакументаў.

***Пісьмы-прэтэнзіі.*** Звычайна іх пішуць, калі адзін бок незадаволены дзеяннямі другога. І не проста дзеяннямі, а абавязкамі, прапісанымі ў дагаворы.

***Просьба.*** Тэкст змяшчае зварот з просьбай. Пачынаецца са слоў «Прашу», «Просім». Самым распаўсюджаным зваротам з'яўляецца просьба аб паўторнай адпраўцы бухгалтарскіх дакументаў.

***Віншаванне.*** Пісьмо, змест якога накіраваны на віншаванне з якім-небудзь святам.

***Запрашэнне.*** Самымі частымі бываюць запрашэнні на канферэнцыі і выставы. Яшчэ адзін паспяховы дадатковы інструмент нагадаць пра сябе партнёру, падтрымаць сувязь, выказаць спадзяванне на далейшае супрацоўніцтва.

***Напамін.*** Змест тэксту паведамляе аб набліжэнні наступлення пэўнага моманту (тэрмін выканання абавязацельстваў, заканчэнне тэрміну дагавора, дата мерапрыемства і г. д.). Адным з прыкладаў такога пісьма з'яўляецца апавяшчэнне ад страхавых арганізацый аб заканчэнні тэрміну поліса.

У апошні час з'явіліся такія жанры як прэс-рэліз (разнавіднасць інфармацыйнага ліста), камерцыйная прапанова (аферта) — гэта заява прадаўца, экспарцёра аб жаданні заключыць здзелку з указаннем яе канкрэтных умоў, адказ на гэтую прапанову (акцэпт).

Перш чым скласці пісьмо неабходна ведаць патрабаванні да структуры, стылю і яго афармлення. Напісанне пісьма патрабуе дакладнай інфармацыі па ўсіх яго рэквізітах, якія будуць унесены.

Правілы пісьма ў дзелавой сферы ўстанаўліваюць адсутнасць мудрагелістых і двухсэнсоўных фраз. У адным пасланні павінна быць адна тэматыка, адна мэта.

Мова пісем адрозніваюцца наступнымі рысамі:

- ✓ дакладнасць падачы інфармацыі;
- ✓ афіцыйнасць;
- ✓ змястоўны, але кароткі выклад;
- ✓ аб'ектыўнасць і структураванасць.

Асноўныя кампаненты пісьма ў дзелавой сферы:

Найменне арганізацыі
Паштовы адрас
Камунікацыйныя і камерцыйныя даныя
(афіцыйна бланк арганізацыі)

Дата №

Адрасат
Найменне арганізацыі
Найменне пасады
Прозвішча, імя, імя па бацьку атрымальніка
Паштовы адрас

Загаловак тэксту

ТЭКСТ

Адзнака аб наяўнасці дадатку
Подпіс
Адзнака аб выканаўцы

Разгледзім самыя асноўныя кампаненты афармлення пісьма ў дзелавой сферы.

**Паштовы адрас** па правілах паказваецца наступным чынам: спачатку назва вуліцы (праспекта або плошчы), нумар дома, індэкс, назва горада, раён, вобласць, назва краіны.

Напрыклад,

вул. Янкі Купалы, 48
220234, г. Мінск

вул. Сонечная, 13
222567, г. Стоўбцы,
Мінскай вобл.

**Адрасат**

Адрасатамі могуць з'яўляцца арганізацыі, іх структурныя падраздзяленні, канкрэтныя службовыя асобы, грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі.

Пры адрасаванні дакумента арганізацыі яе найменне ўказваецца ў назоўным склоне.

Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Генеральнаму дырэктару
кінакампаніі «Узлёт»
Ніканораву І. П.

Пры напісанні пісьма заўсёды неабходна ўключаць «этыкетную рамку» — зварот і камплімент.

Са слоў Д. Карнегі, найбольш даходлівым і дзейсным спосабам заваяваць давер тых, хто навокал, — запомніць іх імёны, а таксама выклікаць у іх пачуццё ўласнай значнасці. Пісьмо, якое пачынаецца з імяннога звароту прыцягне большую ўвагу, чым просты бязадрасны тэкст.

*Паважаны Андрэй Пятровіч!*
*Паважаныя калегі!*

Камплімент — ветлівы выраз, якім заканчаецца пісьмо. Напрыклад,

*З найлепшымі пажаданнямі,*
*Заўсёды рады аказаць Вам паслугу,*
*Сардэчна запрашаем на наш семінар!*
*З найлепшымі пажаданнямі і надзеяй на далейшае супрацоўніцтва!*

**Заданне 13.**
Адкрыццё арт-кафэ «Рэха» запланавана на 7 ліпеня. Складзіце інфармацыйнае пісьмо для апавяшчэння зацікаўленых.

**Заданне 14.**
Складзіце пісьмо-падзяку тым, хто прымаў удзел у падрыхтоўцы арт-кафэ да адкрыцця (клінінгавая кампанія, дызайнерскае бюро і інш.)

**Заданне 15.**
Складзіце пісьмо-прэтэнзію арганізацыі, якая займалася зборам мэблі і не выканала ўмовы дагавору.

## Тэма 4. Аўтабіяграфія

Ёсць адна кніга, якую чалавек абавязаны ўважліва прачытаць, — гэта кніга яго ўласнага жыцця.
*Васілій Розанаў.*

Кнігай уласнага жыцця можна назваць аўтабіяграфію. Перш чым прачытаць гэту кніга, неабходна яе напісаць. Звычайна аўтабіяграфію пішуць пры паступленні на вучобу, працу, службу.

**Аўтабіяграфія** (ад грэч. autos — сам, bios — пішу) — празаічны жанр; як правіла, паслядоўнае свабоднае апісанне аўтарам асабістага жыцця. З аўтабіяграфіі можна зразумець, кім з'яўляецца будучы работнік, даведацца пра яго адукацыю, вопыт, захапленні, уменне выкладаць думкі. Яна дапамагае скласці псіхалагічны партрэт чалавека. Па-гэтаму неабходна сур'ёзна аднесціся да састаўлення аўтабіяграфіі.

Многія творы беларускіх пісьменнікаў маюць аўтабіяграфічную аснову. Паводле формы яны бываюць розныя, у залежнасці ад спалучэння мастацкага вымыслу і канкрэтных фактаў асабістага жыцця. У беларускай літаратуры да жанру аўтабіяграфічных, напрыклад, належаць: *паэма* («Новая зямля», Я. Коласа; «Далёка да акіяна» А. Куляшова), *аповесць* («Аповесць пра сябе» Б. Мікуліча; «Vixi» А. Адамовіча), *раман* («Птушкі і гнёзды» Я. Брыля; «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна), *нарыс* («Што мне рупіць» К. Крапівы; «У роднай глушы» К. Чорнага), *хроніка* («Камароўская хроніка» М. Гарэцкага;), *споведзь* («Зона маўчання» С. Грахоўскага), *мемуары* («Вачыма часу» М. Лужаніна; «Ранішнія росы» Я. Скрыгана), *дзённік* («Лісткі календара» М. Танка; «Думаю. Думаю...»

П. Панчанкі), *падарожныя нататкі* («Дыярыуш» А. Філіповіча, «Крыніца ёсць у родным краі...» Я. Пархуты) і інш.

Дакладных правіл напісанне аўтабіяграфій няма.

- ***Загаловак.*** У самым версе пасярэдзіне ліста пішацца з вялікай літары слова *Аўтабіяграфія*.
- ***Імя.*** З новага радка пішацца цалкам прозвішча, імя, імя па бацьку. Пасля ўказваецца дата і месца нараджэння. Напрыклад: Я, Іваноў Сямён Міхайлавіч, нарадзіўся...
- ***Адукацыя.*** Школьным гадам вялікую ўвагу ўдзяляць не варта, дастаткова будзе проста ўказаць нумар школы. А вось ужо на ўстанове вышэйшай адукацыі, факультэце варта спыніцца падрабязней.
- ***Працоўная дзейнасць.*** Абавязкова патрэбна ўказаць, дзе працавалі раней, назву прадпрыемства і якую пасаду займалі. Неабходна расказаць, якія былі абавязкі, дасягненні і прычыну звальнення. Не варта саромецца расказваць аб павышэннях, узнагародах і заахвочваннях.
- ***Воінская служба.*** У гэтым абзацы мужчынам варта пазначыць, дзе праходзіла служба і званне.
- ***Сямейнае становішча.*** Неабходна коратка расказаць пра сям'ю, жонку(мужа) ці дзяцей, калі такія маюцца (прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, месца пражывання, работы ці вучобы).
- ***Сваякі.*** У некаторых выпадках патрабуецца пазначыць інфармацыю аб бацьках, братах, сёстрах. Пра іх трэба напісаць год нараджэння, прафесію, месца вучобы.
- ***Подпіс і дата.*** Гэта інфармацыя ставіцца аўтарам унізе тэксту. Дата — злева, подпіс — справа.

Прыклад:

Я, Іванова Марыя Пятроўна, нарадзілася 16 жніўня 1985 года ў г. Пінску.

У 1992 годзе была залічана ў 1-ы клас сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 6 г. Пінска. У 2002 годзе закончыла гэту школу з залатым медалём. У гэтым жа годзе паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на юрыдычны факультэт, спецыяльнасць — «Правазнаўства». У 2007 годзе закончыла ўніверсітэт і атрымала дыплом спецыяліста.

Пасля заканчэння ўніверсітэта працавала сакратаром у ІП «Краш». З 2009 года працую юрысконсультам у ААА «Браво».

Замужам за Івановым Пятром Іванавічам, 1978 года нараджэння, з сакавіка 2008 года. Дзявочае прозвішча Пятрова, прозвішча зняніла 04.11.2008г. у сувязі з уступленнем у шлюб. У шлюбе маю сына Іванова Сяргея Пятровіча, 08.11.2010 года нараджэння. Пражываю разам з мужам і сынам у кватэры па адрасе: г. Пінск, ул. Савецкая, д.5, кв. 89.

Бацька, Пятроў Пётр Іванавіч, нарадзіўся 26 чэрвеня 1963 года ў вёсцы Барок Пінскага раёна. Працуе галоўным інжынерам ЗАА «Вір» у Пінску. Пражывае па адрасе: г. Пінск, вул. Сонечная, д.57.

Маці, Пятрова Марыя Сямёнаўна, нарадзілася 23 верасня 1965 года ў г. Пінску, на пенсіі. Пражывае па адрасе: г. Пінск, вул. Сонечная, д.57.

Сястра, Пятрава Ірына Пятроўна, нарадзілася ў 2 лютага1999 годзе ў г. Пінску. У дадзены момант вучацца на 5-м курсе ўстановы адукацыі «Брэсцкі політэхнічны ўніверсітэт». Пражывае па адрасе: г. Брэст, вул. Пушкіна, д. 23, кв. 35.

Ні я, ні мае родныя крымінальнай, адміністрацыйнай адказасці не маюць.

*01.01.2022* *Подпіс* *М.П. Іванова*

## Заданне 16.

Пазнаёмцеся з біяграфіяй Марка Шагала. Што, на ваш погляд, дапамагло Марку Шагалу быць верным сваёй справе і стаць вядомым на ўвесь свет мастаком?

Уявіце сябе вялікім мастаком і паспрабуйце напісаць аўтабіяграфію Марка Шагала.



Марк Шагал нарадзіўся ў Віцебску 6 ліпеня 1887 года ў сям'і дробнага гандляра Хацкеля (Захара) Шагала.

У 19 гадоў па благаславенні маці Фейгі-Іты Марк паступіў у школу вядомага віцебскага жывапісца Юдэля Пэна, які разгледзеў яркі талент і прапанаваў юнаку займацца бясплатна. А праз некалькі месяцаў будучы мастак паехаў вучыцца ў Санкт-Пецярбург.

Некалькі гадоў малады Шагал займаўся ў рысавальнай школе Таварыства заахвочвання мастацтваў пад кіраўніцтвам Мікалая Рэрыха, потым — у прыватнай школе Алены Званцавай, дзе яго настаўнікамі былі знакамітыя Леон Бакст і Мсціслаў Дабужынскі.

У 1910 годзе Шагал прадоўжыў навучанне ў Парыжы: наведваў класы ў свабодных акадэміях мастацтваў, аглядаў разнастайныя выставы і галерэі, асвойваў новыя напрамкі ў мастацтве — кубізм, футурызм, арфізм... І пры гэтым ствараў свой уласны, не падобны да іншых стыль.

У чэрвені 1914 года ў Берліне адбылася першая выстава Марка Шагала, якая аб'яднала амаль усе напісаныя ў Парыжы карціны і малюнкі. Пасля яе поспеху пра Шагала даведаліся многія.

На парозе Першай сусветнай вайны ў 1914 годзе Марк Шагал вярнуўся ў родны Віцебск, а 25 ліпеня 1915 года тут адбылося вяселле з Бэлай Разенфельд — жанчынай, якая стала яго найвялікшым каханнем і натхненнем на ўсё жыццё.

Пасля рэвалюцыі Марк Шагал у 1917 годзе быў назначаны камісарам па мастацтве ў Віцебскай губерні. У любімым горадзе ён заснаваў Народнае мастацкае вучылішча, дзе выкладалі Мсціслаў Дабужынскі, Іван Пуні, Ксенія Багуслаўская, Вера Ермалаева, Эль Лісіцкі, Казімір Малевіч.

У гэты перыяд на радзіме былі напісаны знакамітыя палотны «Над горадам», «Вянчанне», «Прагулка»... І ўсё ж работа ў вучылішчы стала для Шагала расчараваннем з-за творчых непаразуменняў з калегамі.

У 1920 годзе мастак паехаў у Маскву, дзе займаўся афармленнем касцюмаў і дэкарацый у Яўрэйскім камерным тэатры. Потым у яго жыцці зноў былі Берлін і Парыж, дзе Шагал сышоўся са старымі сябрамі і набыў новых — Пабла Пікаса, Анры Матыса, П'ера Банара...

У пачатку Другой сусветнай вайны Марк Шагал з сям’ёй пераехаў у ЗША і ў хуткім часе збіраўся вярнуцца ў Францыю, але ў 1944 годзе раптоўна памерла Бэла. Пасля доўгага перапынку ў памяць аб каханай ён напісаў карціны «Вясельныя агні» і «Побач з ёй».

У Еўропу Шагал вярнуўся ў 1948 годзе. У пасляваенны час яго творчасць суправаджала біблейская тэма. Мноства афортаў да выдання французскай Бібліі, карціны, гравюры, вітражы і шпалеры склалі «Біблейскае пасланне» мастака свету, спецыяльна для якога ў 1973 годзе ў Ніцы ён адкрыў музей. Урад Францыі прызнаў гэты збор афіцыйным нацыянальным музеем.

У 1952 годзе мастак пазнаёміўся з Валянцінай Бродскай, якая стала яго другой жонкай.

У 1977 годзе Шагал удастоены вышэйшай узнагароды Францыі –ордэна Ганаровага легіёна, а ў гонар 90-годдзя майстра ў Луўры адбылася буйная прыжыццёвая выстава яго работ. Насуперак усім правілам, у знакамітай скарбніцы былі выстаўлены карціны аўтара.

Марк Шагал памёр у 1985 годзе ў горадзе Сен-Поль-дэ-Вансе на паўднёвым усходзе Францыі.

**Заданне 17.**

Уявіце, што вас прынялі на работу ў арт-кафе «Рэха» па пасаду адміністратара. Напішыце аўтабіяграфію для ўладкавання на работу.

## Тэма 5. Характарыстыка

**Плануемыя вынікі:** уменне складаць характарыстыку.

**Характарыстыка** — гэта дакумент, які змяшчае абагульненыя анкетныя даныя асобы, на якую ён складаецца. Характарыстыка неабходна пры ўладкаванні на работу, пры паступленні ва ўстановы адукацыі, пры прадстаўленні да ўзнагароды. Такі дакумент складае супрацоўнік (арганізацыі) прадпрыемства або навучальнай установы, у якой асоба, якая характарызуецца, працуе ці вучыцца. Уніфікаванай формы бланка характарыстыкі не існуе, аднак ёсць некалькі правіл, па якіх складаецца дакумент.

Характарыстыка складаецца з 4 частак.

У першай частцы ўказваюцца анкетныя даныя (прозвішча, імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння / пражывання, адукацыя). Гэта інфармацыя пішацца па цэнтры або ў слупок справа. У гэтай частцы павінна быць указана поўная назва прадпрыемства/установы, дзе асоба працуе / вучыцца і пасада).

У другой частцы дакумента ўказваюцца звесткі аб рабоце ці вучобе: месца працы (вучобы); дата пачатку; прафесійныя навыкі, валоданне прафесійным майстэрствам (навучальным матэрыялам); стаўленне да працы ці вучобы.

Трэцяя частка характарыстыкі змяшчае ацэнку дзелавых і маральных якасцей характарызуемага, інфармацыю аб заахвочваннях (спагнаннях), адносінах у калектыве.

У заключнай частцы дакумента адлюстроўваюцца вывады па асобе, у адносінах да якой ён складаецца, а таксама ўказваецца месца прадастаўлення характарыстыкі.

**Заданне 18.**

Напішыце характарыстыку любімага літаратурнага героя, якога б вы хацелі прыняць у арт-кафе «Рэха» на пасаду арганізатара мерапрыемстваў.

**Заданне 19.**

Складзіце характарыстыку літаратурнага героя ці выдуманага чалавека, якому б вы адмовілі ў прыёме на работу.

## Тэма 6. Рэзюмэ

**Плануемыя вынікі:** уменне прэзентаваць сябе, складаць рэзюмэ.

**Рэзюмэ** — дакумент, у якім вы апісваеце асноўную інфармацыю пра сваю адукацыю, вопыт працы, што ўмееце, што можаце і плануеце, і як з вамі звязацца. Да абавязковай інфармацыі можна дабавіць звесткі аб дасягненнях і ўзнагародах.

Першае, што трэба пра сябе напісаць, — гэта ваша імя, імя па бацьку і прозвішча, нумар тэлефона і адрас электроннай пошты.

*Напрыклад:*

Марыя Пятроўна Іванова
+375 291122334
mary_ivanova@mail.by

Рэкамендуем мець асобную электронную пошту для вырашэння рабочых пытанняў. Прыводзім прыклад няўдалага адраса электроннай пошты: marishka_milashka@mail.by гучыць непрафесіянальна. Для рабочай перапіскі лепш мець нейтральны адрас: marina_ivanova@mail.by.

Затым указваецца пасада, на якую вы прэтэндуеце. Пажадана вылучыць гэтую інфармацыю іншым шрыфтам.

У наступнай частцы рэзюмэ вы павінны некалькімі сказамі абазначыць свае перавагі і вызначыць ключавыя навыкі. Гэта дапаможа выдзеліць вас сярод другіх саіскальнікаў.

Для таго, каб аформіць раздзел пра вопыт работы, неабходна ўказаць папярэдняе месца работы, пасаду, абавязкі, дасягненні, вопыт, які набылі.

Пасля ўказання адукацыі абавязкова патрэбна расказаць пра сваю кваліфікацыю. У рэзюмэ інфармацыя пра школу непатрэбна.

Калі ў вас ёсць дадатковыя навыкі, якія будуць карысныя на будучай пасадзе, абавязкова неабходна іх указаць (веданне замежных моў, валоданне ПК і іншае).

Складанне рэзюмэ — гэта працэс, да якога трэба паставіцца сур'ёзна, бо трэба прадумаць, як выгадна апісаць сябе і структураваць інфармацыю ў дакуменце.

**Заданне 20.**

Уявіце сябе шэф-поварам кафэ. Складзіце рэзюмэ супрацоўніка, якога вы абавязковы запрасілі б на размову.

**Заданне 21.**

Падрыхтуйце сваё рэзюмэ, улічваючы вашы планы і жаданні.

## Тэма 7. Распіска

**Плануемыя вынікі:** уменне складаць распіскі.

Каб пацвердзіць факт пазыкі грошай, маёмасці, дакументаў, абавязкаў і іншага паміж дзвюма фізічнымі асобамі, складаецца **распіска**. Гэты дакумент абавязкова павінен змяшчаць найменне дакумента, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара. Можна пазначыць дату нараджэння, пашпартныя і кантактныя даныя. Указваюцца такія ж даныя другога ўдзельніка здзелкі, а таксама пазычаная сума: і лічбамі, і прапіссю, альбо перададзеная маёмасць. Абавязкова ў распісцы павінны быць дата і подпіс пазычальніка.

*Прыклад напісання распіскі:*

РАСПІСКА

4 сакавіка 2022 г. Мінск

Я, Сідараў Пётр Пятровіч, пашпарт МР7654321 выданы Ленінскім РУВД г. Мінска 10.10.2010 г., зарэгістраваны і прапісаны па адрасе: г. Мінск, вул., Паўночная, д. 99, кв. 9, атрымаў ад Іванова Івана Іванавіча, пашпарт МР9876543 выданы Кастрычніцкім РУВД г. Мінска 15.05.2015 г., зарэгістраваны і прапісаны па адрасе: г. Мінска, вул. Паўночная, д. 77, кв. 7, грашовую суму ў памеры 1000 (адной тысячы) рублёў. Абавязваюся вярнуць пазычаную мне грашовую суму не пазней 1 студзеня 2024 г.

У выпадку пратэрміноўкі вяртання пазычанай мне грашовай сумы абавязваюся выплаціць няўстойку ў памеры 0,1 % ад атрыманай мною сумы за кожны дзень пратэрміноўкі.

подпіс П.П. Сідараў

**Заданне 22.**

На дызайнерскае афармленне арт-кафэ вам не хапае сродкаў. Складзіце распіску на пазыку грошай (50 000 рублёў).

**Заданне 23.**

Складзіце распіску на арэнду памяшкання для адкрыцця школы юнага аратара.

## Тэма 8. Перамовы

**Плануемыя вынікі:** уменне весці перамовы.

Для дасягнення сваёй мэты паміж арганізацыямі, кампаньёнамі праводзяцца перамовы. Кожны бок мае аднолькавыя па кантролі сітуацыі і прыняцці рашэння, якое замацоўваецца дагаворам.

Выдзяляюць наступныя стадыі перамоў:

- падрыхтоўка да перамоў;
- перагаворны працэс;
- завяршэнне перамоў і аналіз іх вынікаў.

**Асноўныя правілы правядзення перамоў:**

- Рыхтуйце загадзя пісьмовы план перамоў. Пры гэтым важна выразна разумець сітуацыю; сфарміраваць агульны падыход да перамоў, мэты, задач, пазіцыям; прааналізаваць сілы бакоў; вызначыць магчымыя варыянты рашэння; спраектаваць спрыяльныя ўмовы; падрыхтаваць прапановы і іх аргументацыю; вызначыць найлепшую альтэрнатыву пагаднення, якое абмяркоўваецца, і варыянтаў адмовы ад здзелкі другога боку.
- Захоўвайце спакой і не спяшайцеся. Кантралюйце свае словы і эмоцыі.
- Задавайце ўдакладняючыя пытанні.
- Увесь час вяртайце абмеркаванне да плана перамоў.
- Запісвайце, што вам гавораць[

**Заданне 24.**

Складзіце план правядзення перамоў і правядзіце іх з пастаўшчыком кніжных навінак.

## Тэма 9. Прэзентацыя альбома дзелавых тэкстаў

**Прэзентацыя** — грамадскае прадстаўленне чаго-небудзь новага, створанага. Поспех прэзентацыі залежыць ад ступені гатоўнасці да зносін з аўдыторыяй, захавання аратарскага такту, валодання тэмай, правільнасці адказаў на пытанні і г. д. Ваша задача пабудаваць прэзентацыю так, каб яна адгукалася аўдыторыі і зрабіць аб’ект прэзентацыі для прысутных такім жа зразумелым і цікавым, якім ён з’яўляецца для вас.

Эфектыўнасць прэзентацыі пачынаецца з паслядоўнай падрыхтоўкі матэрыялаў да выступлення:

1. Праводзіцца аналіз складу, характару аўдыторыі.
2. Складаецца план, пішацца тэкст, распрацоўваюцца наглядныя матэрыялы.
3. Вызначаецца пералік магчымых пытанняў і рыхтуюцца адказы да іх.

**Заданне 25.**

Правядзіце прэзентацыю альбома дзелавых тэкстаў. Месца правядзення арт-кафэ «Рэха».